Зьв...

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі (б) Беларусі

Год выданьня—XIV
№ 301 (3902)
Панядзелак, 29 сьнежня 1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзенна за выключэньнем нядзяльных

Государственная публичная научная библиотека Н.Т.У.-В.С.Н.Х.А

Важнейшая задача партыі

Бурныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, забясьпечаныя ленінскай лініяй партыі, няўхільна суправаджаюць павышэньнем матар'яльнага ўзроўню рабочае клясы і працоўных мас.

Посьпехі прамысловасьці, якая выробляе прадметы шырокага спажываньня, дасягнутыя на аснове гігаманцкага размаху ў будаўніцтве цяжкай індустрыі, рашучыя меры партыі, забясьпечыўшыя ў найкарацейшы тэрмін вырашэньне ў асноўным збожжавай праблемы, фарсаванае разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі—усё гэта зараз стварае такое становішча, пры якім таварныя і харчовыя рэсурсы краіны дазваляюць, пры ўмелым разьмеркаваньні, пры строгім захаваньні выразнай клясавай лініі, задаволіць асноўныя запатрабаваньні рабочага спажыўца. Яшчэ большыя магчымасьці пашырэньня таварна-харчовай базы прадугледжваюць кантрольныя лічбы разьвіцьця народнай гаспадаркі ў 1931 годзе.

Такім чынам, мы ўжо выходзім з паласы найбольшых затрудненьняў у галіне забесьпячэньня.

Посьпехі, дасягнутыя партыяй з рабочай клясай у справе забесьпячэньня, зьяўляюцца яшчэ адным перамогай на фронце барацьбы за сацыялізм, ударам па правых і «левых» апартуністах, якія ўсяк імкнуцца выкарыстаць у сваіх антыпартыйных мэтах труднасьці нашага росту, спэкулюючы на таварна-харчовых затрудненьнях.

Зразумела, гэтыя дасягненьні ні ў якай меры не даюць права на самасалакаваньне, на недаацэнку яшчэ наяўных труднасьцяй, на аспабленьне ўвагі вакол адказьнейшых задач, зьвязаных з праблемай забесьпячэньня, якія стаяць перад намі.

Апошнім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) гэта праблема пастаўлена перад усёй партыяй, усёй пралетарскай грамадзкасьцю, як адна з асноўных, важнейшых, непарыўна зьвязаных з усім сацыялістычным будаўніцтвам.

З асаблівай сілай пленум падкрэсьліў неабходнасьць карэннага паляпшэньня работы органаў разьмеркаваньня, бо буйнейшыя недахопы сыстэмы спажывецкай каапэрацыі — гэтага асноўнага апарату разьмеркаваньня — скрозь і ўсюды зьяўляюцца прычынай абвастрэньня харчовых і таварных затрудненьняў, фактарам зьніжэньня таго эфэкту, які мог-бы быць пры наяўных рэсурсах дасягнуты ў галіне забесьпячэньня пры ўмове ўмелага манэўраваньня таварнымі масамі і харчовымі рэзэрвамі, пры выразным ажыцьцяўленьні клясавых прынцыпаў разьмеркаваньня.

Рэканструкцыйны пэрыяд паставіў перад спажывецкай каапэрацыяй рад новых адказьнейшых задач.

Спажывецкае забесьпячэньне, якое зьяўляецца адным з важнейшых момантаў усяго нашага будаўніцтва, павінна стаць магутнай зброяй пераходу ўсяе народнае гаспадаркі на сацыялістычныя рэйкі, сродкам заахвочаньня камуністычных мэтадаў работы, росту ўдарніцтва, павышэньня прадукцыйнасьці працы, перабудовы быту, выкананьня выторчых праграм, пасьпяховага ажыцьцяўленьня лозунгу суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва, як класы.

Зусім відавочна, што гэтыя сур'ёзьнейшыя задачы спажывецкай каапэрацыяй, таксама, як і іншымі органамі забесьпячэньня, могуць быць выкананы толькі пры ўмове правядзеньня вызначаных клясавай лініі ў рабоце ўсіх сваіх зьвеньняў, пры ўмове рашучага наступленьня на капіталістычныя элементы горада і вёскі, бязьлітаснага змаганьня з апартунізмам усіх масьцей.

Клясавыя ворагі — шкоднік, купан, нэпман — напружваюць усе свае намаганьні, каб падарваць справу забесьпячэньня, замарудзіць гэтым нашо прасоўваньне ўперад. Вядомы працэс шкодніцкай у забесьпячэньні, штодзеннае ўпартае змаганьне кулацтва на харчовым фронце, яго супрацьлеглае выкананьню вызначаных цьвёрдых заданьняў, спробы кулака і нэпмана сарваць загатоўкі, дэзарганізаваць рынак, разьвіць спэкуляцыю—усё гэта з поўнай відавочнасьцю пацьвярджае, што справа забесьпячэньня ёсьць вучастак вострага клясавага змаганьня, што толькі арганізаваны адпор пралетарскай дзяржавы і грамадзкіх гаспадарчых арганізацый, асноўнай з якіх зьяўляецца спажывецкая каапэрацыя, можа даць пасьпяховае вырашэньне праблемы забесьпячэньня.

Спажывецкая каапэрацыя ня здолела перабудаваць сваёй работы для выкананьня пастаўленых перад ёю задач. Пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьліў гэта, прызнаўшы «работу Цэнтрасаюзу і органаў спажывецкай каапэрацыі на мясцох нездавальняючай».

Дзе карэньні прарываў у рабоце спажывецкай каапэрацыі? «Важнейшымі недахопамі спажывецкай каапэрацыі зьяўляюцца наяўнасьць «нейкага нэпманскага духу» ў рабоце, элементы самацёку, бюракратызму і апартунізму на практыцы, якія прыводзяць да затараваньня ва ўмовах дэфіцытнасьці тавараў, засьмечаньня апарату чужымі, а таксама шкодніцкімі элементамі, спасьбасьць работы па арганізацыі і ўпарадкаваньні справы грамадзкага харчаваньня, слабы ўдзел каапэраваных мас спажыўцоў у рабоце па кантролі і кіраўніцтве спажывецкай каапэрацыяй і адсутнасьць разгорнутай самакрытыкі».

Пастановы пленуму высоўваюць перад усёй сыстэмай спажывецкай каапэрацыі, у тым ліку перад сыстэмай каапэрацыі Беларусі, задачу карэннай перабудовы сваёй работы ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі пераживаньня намі парыву.

Бязьлітасная барацьба з «торгашескім духом», апартуністычнай практыкай, узмацненьне каапэрацыйных кадраў, ачышчэньне апарату ад варожых элемэнтаў, упартае змаганьне з замкнутасьцю, адарванасьцю ад мас — вось асноўныя шляхі, па якіх павінна пайсьці ўзмацненьне каапэрацыі.

Ясна, што выкананьне дырэктыў пленуму нямысьліма бяз самага актыўнага ўдзелу партыйных і прафсаюзных арганізацый, бяз дзейнага пралетарскага кантролю на ўсіх вучастках каапэрацыйнай работы.

Партарганізацыі павінны забясьпечыць канкрэтнае штодзеннае кіраўніцтва каапэрацыяй, узмацніць каапэрацыйныя кадры.

Рад прафарганізацый БССР яшчэ да гэтага часу стаяць у баку ад пытаньняў рабочага забесьпячэньня. Вельмі паказальна, што адно з каштоўнейшых праяўленьняў актыўнага ўдзелу рабочых мас у ажыцьцяўленьні кантролю, у вышукваньні сродкаў для пашырэньня базы забесьпячэньня — сустрэчны каапэрацыйны плян — да гэтага часу яшчэ не знайшоў належнага падтрыманьня з боку прафсаюзаў. На многіх прадпрыемствах партыйныя і прафэсыянальныя органы і адміністрацыйнае кіраўніцтва не аказваюць элемэнтарнай дапамогі органам ЦРК.

Далей падобнае становішча зусім нецярпіма. Пытаньні забесьпячэньня павінны, нарэшце, заняць належнае месца ў рабоце партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый. За перабудову работы каапэрацыі ў духу пастаноў пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) трэба ўзяцца неадкладна і сур'ёзна.

Пленум вызначыў, што бліжэйшымі практычнымі задачамі каапэрацыі зьяўляюцца ўпарадкаваньне работы закрытых разьмеркавальнікаў, паляпшэньне работы агульных каапэрацыйных магазынаў, паляпшэньне стану сеткі спажывецкай каапэрацыі ў вёсцы, у першую чаргу ў яе сацыялістычным сэктары, упарадкаваньне справы грамадзкага харчаваньня, максымальнае прыстасаваньне асартымэнту тавараў да запатрабаваньняў спажыўца, ажыцьцяўленьне жорсткага рэжыму эканоміі, узмацненьне фінансавай гаспадаркі каапэрацыі і, нарэшце, падрыхтоўка спэцыялістаў-каапэрацыяраў. За гэтыя практычныя і штодзенныя пытаньні работы трэба нездкладна ўзяцца, закасаўшы рукавы.

Ачышчаючы каапэрацыйны апарат ад усяго чужога, клясава-варожага, выкарчоўваючы апартуністычную практыку, узмацняючы каапэрацыю пралетарскімі кадрамі, арганізуючы масавы дзейны кантроль, вядучы рашучае наступленьне на кулака і нэпмана, пад цьвёрдым кіраўніцтвам партыі, пры дапамозе прафсаюзаў—мы даб'ёмся карэннага паляпшэньня ў рабоце спажывецкай каапэрацыі, даб'ёмся поўнага выкананьня «важнейшай задачы партыі па забесьпячэньні рабочых узрастаючай індустрыі і калгаснікаў нармальным забесьпячэньнем».

Да арганізацыі „камісіі выкананьня" пры СНК СССР

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) адзначыў другі год пяцігодкі, які скончыўся, як год «новых буйнейшых дасягненьняў рабочай клясы ў справе сацыялістычнага будаўніцтва». Савецкая краіна непахісна ідзе на шляху, вызначаным ленінскай партыяй, па шляху да сацыялізму, перамагаючы ўсе труднасьці на гэтым шляху, даючы рашучы адпор усім варожым пралетарскай дыктатуры элемэнтам і іх агентуры ўнутры партыі — апартуністам усіх масьцей, дэзарганізатарам сацыялістычнага наступленьня, у першую чаргу правым апартуністам.

Вялізарныя посьпехі, дасягнутыя ў другім годзе пяцігодкі на падставе генэральнай лініі партыі, на базе бурнай актыўнасьці рабочай клясы, — далі магчымасьць партыі і ўраду прыняць для трэцяга году пяцігодкі больш высокія тэмпы разгортаньня нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

У выкананьні задач, якія стаяць перад усёй нашай краінай у справе ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры гады, роля нашага дзяржаўнага апарату надзвычай адказная.

Ад усіх звеньняў апарату пралетарскай дыктатуры патрабуецца поўнае выкананьне ўсіх дырэктыў цэнтру і яшчэ большае ўзмацненьне дысцыпліны ва ўсёй рабоце дзяржапарату.

Між тым, практыка работы дзяржапарату, асабліва чыстка савецкага апарату, асабліва рад яркіх фактаў, калі выключана значэньня дырэктывы проста ня выконваюцца ці скажаюцца работнікамі савецкага апарату.

Перш за ўсё такое становішча з выкананьнем дырэктыў тлумачыцца **засьмечанасьцю** апарату. Клясавы вораг, бюракрат, шкоднікі з «прампартыі» рабілі ўсё, каб аслабіць дзяржапарат, падначаліць пэўныя яго зьвеньні інтарэсам кулака і інтэрвэнтам, каб зрываць выкананьне важнейшых дырэктыў партыі, затармазіць пераможны ход сацыялістычнага будаўніцтва. Шкоднікам у іх рабоце значна дапамагалі апартуністы. Яны расчышчалі глебу для шкодніцкай дзейнасьці Раманых і Ларычавых. Яны рабілі ўсё, каб **фактычнае** выкананьне дырэктыў партыі і ўраду падмяняць **паперовым**, фармальным.

Партыя за апошні час мае рад дасягненьняў у барацьбе за паляпшэньне апарату, у барацьбе з бюракратызмам. Але вялікія задачы, якія паўстаюць перад дзяржапаратам у сувязі з трэцім рашаючым годам пяцігодкі, патрабуюць значнага ўзмацненьня барацьбы з бюракратызмам і ў першую чаргу ўзмацненьня праверкі фактычнага выкананьня ўсімі савецкімі органамі праграмы трэцяга году пяцігодкі.

У сьвятле гэтых фактаў асабліва значэньне набывае арганізаваная **«камісія выкананьня» пры СНК СССР.** На «камісіі» ўскладаецца задача — **арганізацыя па ўсіх зьвеньнях апарату пралетарскай дыктатуры зьверху да нізу жорсткай праверкі фактычнага выкананьня ўрадавых дырэктыў.**

Гэта патрабуе ў першую чаргу поўнасьцю рэалізаваць указаньні Леніна аб устанаўленьні «самай дасканалай **адказнасьці** кожнай са стаячых на любой савецкай пасадзе асоб за выкананьне пэўных, ясна і пядзюзначна акрэсьленых заданьняў і практычных работ. Выкананьне гэтага правіла, без якога немагчыма правядзеньне сапраўднага кантролю, і падбор найбольш падыходзячых асоб на кожную пасаду і на кожную работу павінна стаць ад гэтага часу бязумоўна абавязковым». Пад гэтым пунктам погляду трэба перагледзець структуру савецкіх устаноў. Гэта задача цяпер значна аблягчаецца ў сувязі з праведзенай партыяй ліквідацыяй акруг і ўзмацненьнем раёнаў.

Работа «камісіі» і ўзмацненьне праверкі выкананьня павінна прывесьці да паляпшэньня **падбору** людзей, да зьмяшчэньня нягодных і больш правільнай расстаноўкі работнікаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Зусім зразумела, што для таго, каб «камісія выкананьня» справілася з вялізарнейшымі задачамі, якія на яе ўскладаюцца, трэба **ў дапамогу «камісіі» арганізаваць масавы рабочы кантроль зьнізу.**

Работа «камісіі выкананьня» ні ў якай ступені ня зьніжае задач праверкі выкананьня, якую праводзяць органы РСІ. Наадварот, **работу па шэфстве прадпрыемстваў над дзяржапаратам, якою кіруюць органы РСІ, трэба будзе яшчэ больш разгарнуць.** Трэба ўсяляк заахвочваць разгортаньне новых форм масавага кантролю рабочых над дзяржапаратам, напрыклад, начыньнае рабочых Электразаводу (Масква) па **стварэньні Інстытуту памочнікаў кіраўнікоў сэктарамі ў савецкіх установах з ліку рабочых ударнікаў.** Паводле гэтага праекту рабочыя выконваюць свае абавязкі ў парадку грамадзкай работы, не адрываючыся ад прадпрыемстваў.

За далейшае разгортваньне найбольш дзейных форм масавага кантролю рабочых над дзяржапаратам павінны заразжа ўзяцца нашы прафэсыянальныя саюзы і органы ЦКК-РСІ.

Работа «камісіі выкананьня», пры дапамозе такога масавага кантролю зьнізу, забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне бальшавіцкай праграмы рашаючага году пяцігодкі на падставе непахіснага правядзеньня генэральнай лініі партыі і барацьбы на два фронты.

М. З.

Спаткаць новы гаспадарчы год падрыхтаванымі

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦСПСБ

Праграма сацыялістычнага будаўніцтва на трэці рашаючы год пяцігодкі, зацьверджаная сьнежаньскім аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б), ставіць перад прафсаюзамі з усёй сілай задачу — сустрэць трэці год максымальна падрыхтаванымі, сканцэнтраваць увагу рабочае клясы на кожным прадпрыемстве і ўсёй прамысловасьці БССР у цэлым, на ўсямерным забесьпячэньні тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, на поўным выкананьні і перавыкананьні колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну, забясьпечыўшы ўжо са студзеня месяца неабходныя высокія вытворчыя тэмпы кожнага прадпрыемства і не дапускаючы ні ў якім разе іх зьніжэньня.

Выкананьне гэтай адказьнейшай задачы высоўвае перад усімі гаспадарчымі і прафсаюзнымі арганізацыямі неабходнасьць бездакладна вызначыць рад канкрэтных арганізацыйных і рацыянналізатарскіх мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць падрыхтоўку і выкананьне задач, выцякаючых з трэцяга рашаючага году.

Прэзыдыум ЦСПСБ на аснове гэтага прапануе ўсім ЦП саюзаў, гарпрафсаветам, райпрафсаветам і ФЗМК:

1. 30-31 сьнежня правесьці на ўсіх прадпрыемствах па цэхах, групах, ударных брыгадах сходы рабочых, на якіх падагуліць вынікі выкананьня прамфінпляну асобнага кварталу ў разрэзе сваіх задач, выявіўшы ўсе вузкія месцы вытворчасьці і распрацаваўшы канкрэтныя каляндарныя пляны па хутчэйшай іх ліквідацыі, мабілізуючы для гэтай мэты ўсіх ударнікаў і ІТР.

2. 1-га студзеня правесьці агульназаводзкія сходы пад пёзунгам «праверкі падрыхтаванасьці прадпрыемства да выкананьня кантрольных лічбаў 1931 году», мабілізуючы ўсіх рабочых вакол пастаўленых задач перад кожным прадпрыемствам паасобна (высуноуць перад кожнай ударнай брыгадай на аснове сустрэчнага прамфінпляну пэўны рацыяналізатарскі мінімум).

3. На працягу першых 10 дзён студзеня праз групавыя, брыгадныя і агрэгатныя вытворчыя нарады правесьці давядзеньне прамфінпляну да варштату і да кожнага рабочага, мабілізуючы для гэтага ўсе тэхнічныя сілы прадпрыемства.

4. Паставіць, як правіла, ва ўсіх ударных «сквозных» брыгадах, групах, агрэгатах і цэхах пэрыядычныя (адзін раз у дэкаду) справаздачы адміністрацыі розных зьвеньняў аб выкананьні прамфінпляну ў зьвеньневым і агульназаводзкім разрэзе з прыняцьцем рашучых мер да бездакладнага зьнішчэньня ўсіх непаладак і недахопаў, якія гармозяць пасьпяховае выкананьне вытворчых заданьняў як у колькасных, так і ў якасных адносінах.

5. Студзень месяц павінен зьявіцца месяцам рашучага пералому ў справе разгляду ўсіх рабочых прапаноў і іх рэалізацыі, месяцам праверкі станоўішча вынаходзтва (рэалізацыі вынаходзтваў, стварэньня ячэек вынаходцаў, аказаньня ім тэхнічнай дапамогі). Адначасова неабходна арганізаваць новы шырокі прыток рабочых прапаноў і вынаходзтваў, накіраваных на справу рацыяналізацыі і ўдасканаленьня вытворчасьці.

6. На працягу студзеня месяца рашуча перабудаваць формы прафработы, у прыватнасьці вытворчыя нарады, дабіўшыся перанясеньня на справе цэнтру цяжкасьці ўсёй прафработы ў першапачатковыя низавыя зьвеньні (група, агрэгат, брыгада, цэх).

7. На працягу ўсяго месяца асабліва рашуча павінны быць перагледжаны формы і мэтады пастаноўкі на прадпрыемствах, у клюбах і чырвоных кутках палітычна-выхаваўчай і культурна-масавай работы з падпарадкаваньнем яе на справе выкананьню прамфінпляну, барацьбе з прарывамі, павышэньню прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту, барацьбе з непаладкамі на вытворчасьці, ілжэ-ўдарніцтвам, пятунствам, рвацтвом і прагуламі.

8. Уся гэта работа павінна быць арганічна ўвязана з бягучымі гаспадарча-палітычнымі задачамі, якія стаяць у цяперашні момант перад прафсаюзамі (калдагаворная кампанія, перавыбары саветаў, усесаюзны конкурс і конкурс на тры сьцягі, мабілізацыя фінансавых сродкаў, мабілізацыя ўнутраных і захаваных рэсурсаў і інш.).

9. Усе гэтыя мерапрыемствы павінны мець сваёй мэтай далейшае разгортваньне сацсаборніцтва і ўдарніцтва, уздым яго на вышэйшыя ступені («сквозные» брыгады, пляняза-апэрацыйныя групы, грамадзкі бюкэр, праверачныя дзесяцідзёўкі і інш.), у прыватнасьці, асабліва павінна быць узмоцнена спаборніцтва за якасьць прадукцыі і магутны новы прыліў ударнікаў імя трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Французскі імпэрыялізм узбройвае сваіх васалаў

У той час, як фашысцкая Польшча перажывае вострыя эканамічны крызіс, калі кожны дзень закрываюцца ўсё новыя фабрыкі і заводы, а дзесяткі тысяч рабочых выкідваюцца на вуліцу, калі **блізка мільёна рабочых галадае,**—фашысцкі ўрад кідае мільярды на дадатковыя ўзбраеньні, на падрыхтоўку ўзброенага нападу на Савецкі Саюз. Апошнімі днямі польская буржуазная прэса паведамляе, аб перагаворах польскага фашызму з французкай фірмай Шнэйдэр Крэзо **аб пазыцы 1 мільярду франкаў пад залог стратэгічнай чыгункі, якая зараз будуецца і павінна злучыць Верхнюю Сілезію з портам Гдыняй.** Перагаворы гэтыя ў справе пазыкі з боку Польшчы вядзе **генэрал Гурэцкі**—адзін з вылатнейшых пілсудчыкаў. Нават **«Роботнік»** орган польскіх сацыял-фашыстаў зазначае, што **«большая частка французкай пазыкі будзе прызначана на мэты, якія нічога супольнага ня маюць з гаспадарчым жыцьцём краіны».** Калі дадаць да гэтага, што пазыку мае вядомая фірма па вырабу гармат і ваеннага рыштунку, дык ясна стане, што фашысцкая Польшча атрымае яе пераважна ў выглядзе новых транспэртаў зброі і ваеннай амуніцыі.

Адказ працоўных БССР шкоднікам і інтэрвэнтам

Удзельнікі нарады актыву Спаскага сельсавету, Сіроцінскага раёну, **уносяць 88 руб. на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» і выклікаюць усе сельсаветы Сіроцінскага раёну.**

— **Калектыў інстытуту фізыятрыі і нэўрапаталёгіі ў Менску ўносіць** на пабудову самалёту **152 руб. і выклікае ўсе іншыя калектывы пекавых устаноў.**

— **Ячэйка Асоавіяхіму Спуцкай добраахвотнай пажарнай каманды ўносіць у фонд дэкады абароны 141 руб. 45 кап. і выклікае іншыя добраахвотныя пажарныя дружыны БССР пасьледаваць яе прыкладу.**

— **Ельскі вучпункт па-завайсканскіку** у колькасьці 197 чал. **уносіць 90 руб.,** заробленых на суботніку, на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў», а таксама **82 руб. 16 кап.,** сабраных па падпісным лісьце, а **ўсяго 172 руб. 16 кап. і выклікае Лельчыцкі вучпункт пасьледаваць іх прыкладу.**

— **Старшыня Дзяржпляну БССР тав. Гольдбэрг** уносіць свой ганарар—12 руб. — за артыкул, зьмешчаны ў газ. «Зьвязда» на пабудову дырыжабля імя «Правды».

— **Камандзір запасу Пазьнякевіч,** жыхар гор. Полацку, **уносіць** у фонд абароны краіны **20 руб.**

— **Курсанты 6-месячных курсаў школы прафруху пры Бабруйскім райпрафсавеце** ў ліку 36 чал. разам з пастаўнікамі, заробленыя грошы на пядзьлініку ў суме **72 руб. уносяць на пабудову дырыжабля імя «Правды».**

— **Працаўніні 31-й сямігодні Менску** уносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 14 руб. 50 кап. і **выклікаюць 7-ю менскую школу.**

— **Калектыў рабочых чэрніцкага млыну,** Лёзьненскага раёну, **уносіць 36 руб. 65 кап.** у фонд дырыжаблябудаўніцтва **і выклікае ўсіх рабочых млыноў Лёзьненскага раёну пасьледаваць іх прыкладу.**

— **Кулямётная рота Аб'яднанай Беларускай вайсковай школы сабрала па** падпісным лісьце і ўнесла **183 р. 80 к.** на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў». Збор сродкаў працягваецца.

— **Студэнты хэміка-тэхналёгічнага інстытуту і тэхнікуму** ўносяць у фонд дырыжаблябудаўніцтва: **3-ці курс хэмікаў — 100 руб., 3-ці курс тэрфанікаў— 60 руб., 2-гі курс — 47 руб., 1-шы — 60 рублёў, а ўсяго — 267 рублёў і выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу** студэнтаў інстытуту і архітэктурна-дарожна-будаўнічага тэхнікуму.

— **Працоўнае сялянства вёскі Хобнае,** Юравіцкага раёну, уносіць на пабудову дырыжабля імя «Правды» **80 руб. і выклікае вёску Мутыжар,** Хобенскага сельсавету, пасьледаваць іх прыкладу.

— **Ад грамадзян м. Пухавічы** ў фонд дырыжаблябудаўніцтва паступіла **19 р.**

— **Капыльскі райкаапмалжывёпасаюз уносіць** у фонд дырыжаблябудаўніцтва **5 руб.**

— Прыслана на пабудову дырыжабля імя «Правды» **лучэйкай ЛКСМБ 47 руб. 11 кап.**

— Атрымана ад **Бялыніцкага райпрафсавету** на пабудову дырыжабля імя «Правды» **75 руб. 65 кап.**

— У адказ на шкодніцтва контр-рэвалюцыянэраў з «прампартыі» **бэтрака-бядняцкія і серадняцкія масы Сьвяціпаўскага сельсавету ўносяць** на пабудову дырыжабля «Калгасьнік» **344 руб.**

— **Мясцком і супрацоўнікі с.-г. Горацкай акадэміі і зоаінстытуту ўносяць** на пабудову дырыжабля імя «Правды» **198 руб.** Збор сродкаў працягваецца.

— **Працоўнае насельніцтва Выдрэйскага сельсавету,** Высачанскага раёну, **уносіць** у фонд дырыжаблябудаўніцтва **129 руб. 49 кап.**

— Паступіла ў фонд дырыжаблябудаўніцтва ад **Горскай рыбапоўнай арцелі,** Зарачанскага сельсавету, **10 руб. 50 кап. і 18 руб. ад Гарадоўскай рыбарцелі,** Гарбаніцкага сельсавету.

— **Супрацоўніні Лагойскага райкаапсаюзу ўносяць** у фонд дырыжаблябудаўніцтва **50 руб.**

1-я менская партканфэрэнцыя

Вячэрняе пасяджэньне партканфэрэнцыі 27-га сьнежня і ранішняе наступнага дня былі прысьвечаны абмеркаваньню дакладу тав. Грысевіча аб выніках выкананьня прамфінпляну асобнага кварталу і задачах менскай гарадзкой партарганізацыі ў трэцім годзе пяцігодкі.

Рад выступаўшых у спрэчках тавары шоў, аналізуючы прычыны існуючых прарываў на паасобных прадпрыемствах, завастралі ўвагу на задачах змаганьня за якасьць прадукцыі, супроць апартуністычнай недаацэнкі гэтага важнейшага пытаньня.

— Пытаньню якасьці прадукцыі, — гаворыць тав. **Плеўнік,** — многія партыйныя, прафсаюзныя арганізацыі і гаспадарнікі на прадпрыемствах не надаюць таго значэньня, якое надаецца партыяй. Наша канфэрэнцыя заслухала прывітаньні ад рабочых дэлегацый дзесяткаў менскіх прадпрыемстваў. Колькасныя паказальнікі выкананьня прамфінпляну гэтымі прадпрыемствамі — 100%, 104%, 116%, а **з якасными паказальнікамі** справа стаіць інакш. Тут мы маем недапушчальнае адставаньне. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі на мясцох павінны ўжыць усе неабходныя захады для таго, каб у самы хутчэйшы тэрмін дабіцца пералому ў пытаньні якасьці прадукцыі. Да гэтага пытаньня трэба прыкласьць увагу «трыкутнікаў» і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Тав. **Школьнікаў** адзначыў, што за ўдарны квартал прамфінплян па фабрыцы **«Камунарцы»** выканан 26 сьнежня на 103 проц. пры значным пераломе ў бок паляпшэньня якасьці прадукцыі.

Змаганьне за добраякасную прадукцыю зьяўляецца сустаўной задачай павышэньня раальнай зарплаты. Нядрыклад, тэрмін носкі спэцвопраткі, у прыватнасьці абутку, устаноўлен на 9—12 месяцаў. Гэтых тэрмінаў ні ў якім выпадку ня вытрымлівае абутак, які зараз выробляецца. Аб кепскай якасьці прадукцыі мы шмат гаворым, а вруху ў гэтай справе няма. **Неабходна ўнесьці аператыўныя зьмены ў самую сыстэму бракоўкі.**

Важнай задачай у справе забесьпячэньня пасьпяховага выкананьня прамфінпляну зьяўляецца стварэньне здаровых умоў на прадпрыемствах для культурнага і бытавога абслугоўваньня рабочых. У нас пабудавана новая фабрыка, у сувязі з чым колькасьць рабочых з 520 чалавек павялічыцца ў кадыходзячым годзе да 1.560, валавая прадукцыя павялічыцца ў 4 разы, прадукцыйнасьць працы — на 42%. І вось будаўнічыя арганізацыі ня ўлічылі неабходнасьці пабудовы памяшканьняў пад клюб, чырвоны куток, сталоўку і дзіцячыя ясьлі.

Тав. **Дзбравольскі** гаварыў аб значэньні мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў справе забесьпячэньня выкананьня прамфінпляну. Прамоўца адзначыў, што гэтай справе не аддаецца належная ўвага фабрычна-заводзкімі партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі. Райкомы партыі **не займаліся** праверкай выкананьня ячэйкамі дырэктыў ЦК па гэтым пытаньні. Кіраўніцтвы некаторых прадпрыемстваў да гэтага часу ніяк ня могуць дагаварыцца з ашчадкасай, каб перадаць касавы пункт ашчадапарату.

У выніку такіх адносін плянавыя заданьні на асобных квартал па ўцягненьні ў ашчадкасу новых укладчыкаў па Менску ня выкананы. З прычыны слабой работы камісіі садзейнасьці і адсутнасьці ўвагі да пытаньня мабілізацыі сродкаў праз ашчадкасы з боку раду партячэек і прафсаюзных арганізацый, за апошні час мы мелі некаторы адліў укладчыкаў.

Паводле плянавых меркаваньняў на 1931 год, мы павінны ў першым квартале гэтага году па горадзе Менску ўцягнуць новых укладаў на суму 330.000 рублёў. Партыйная арганізацыя павінна забясьпечыць выкананьне гэтай лічбы адпаведнай работай.

— Шпаркі рост разьвіцьця нашай прамысловасьці, — адзначыў тав. **Аксючыц,** — сустракае на сваім шляху рад труднасьцяй. Жыльлёвае будаўніцтва не адпавядае колькасному росту рабочых. За мінулы год на некаторых прадпрыемствах колькасьць рабочых павялічылася на 400-500 чалавек. Кіраўніцтва гэтых прадпрыемстваў ня ставіла сваёчасова пытаньня аб кватэрах для рабочых і, калі апынаецца перад фактам, тады ідзе ў гарсавет з патрабаваньнем «давай кватэры». Зразумела, што гарсавет адказвае за стан гаспадаркі гораду, у тым ліку і за жыльлёвае пытаньне, аднак, гэта пытаньне ня так проста вырашаецца, як мы да яго адносімся.

Далей тав. Аксючыц спыніўся на кепскім стане кіраўніцтва мясцовай прамысловасьцю. Ня гледзячы на вялікае значэньне ў нашых умовах мясцовай прамысловасьці, яна знаходзіцца ў стане «бясспрытульнасьці». Мы да гэтага часу ня маем прамфінпляну мясцовай прамысловасьці на новы год, бо ён яшчэ не санкцыянаваны ВСНГ.

Згаджаючыся з правільнай пастаноўкай радам таварышоў пытаньня, што няма кепскіх прадпрыемстваў, а ёсьць кепскія кіраўнікі, тав. **Фішбайн** падкрэсьліў адсутнасьць належнага кіраўніцтва прадпрыемствамі з боку ВСНГ і Мэталяаб'яднаньня. Мы ня маем ніводнага выпадку, каб ВСНГ склікаў нараду дырэктараў прадпрыемстваў для прапрацоўкі важнейшых пытаньняў вытворчасьці. Паводле пастановы ЦК КП(б)Б ВСНГ у лістападзе месяцы вылучыў брыгады для ліквідацыі прарываў. Такая брыгада была прымацавана і да заводу «Энергія». У якасьці брыгадзіра зазірнуў раз на завод тав. Стракоўскі і больш не паказаўся. Некалькі дзён пабыў на прадпрыемстве інжынэр, але потым ён не зьявіўся і ніякага напрамку ў нашай далейшай рабоце ня даў.

Тав. **Вайнэровіч** на радзе фактаў паказаў няўменьне Мэталяаб'яднаньня плянаваць сырэц. У выніку гэтага стварылася такое становішча, што некаторыя прадпрыемствы, якія ўваходзяць у першую катэгорыю па забесьпячэньні сырэцам, ня выканалі плянаў ударнага кварталу. Зараз-жа, калі на прадпрыемствах прапрацаваны пляны на новы гаспадарчы год і даведзены да нізавых вытворчых зьвеньняў, кіраўнікі трэсту ставяць пытаньне аб пераглядзе прамфінпляну, што вельмі кепска адбіваецца на рабоце прадпрыемства. Трэст не задаволены вырашэньнем высунутых пытаньняў з месц аб рацыянальным скарыстаньні кваліфікаванай рабочай сілы, сваячасовай адпраўцы па прызначэньні прадукцыі і г. д.

Тав. **Шульман** у сваёй прамове галоўным чынам спынуўся на пытаньні аб кадрах. Непасрэдным кіраўніком, — гаворыць ён, — зацікаўленым у падрыхтоўцы інжынэрна-тэхнічных сіл, які зьвязвае вучобу з праграмай, зьяўляецца ВСНГ, аб'яднаньне трэстаў, транспарт, наркаматы, якія гэтых людзей будуць у сябе скарыстоўваць. Аднак, ВСНГ БССР нічога ня ведае, што робіцца ў інстытутах, тэхнікумах, і ў іх рабоце па сваёй лініі не дае напрамку. У абмеркаваньні навуковых плянаў ВСНГ ня прымае ніякага ўдзелу. На нашы запытаньні аб укамплектаваньні спэцыялістамі хэміка-тэхналёгічнага інстытуту кіраўнікі з ВСНГ упарта маўчаць.

Нядбайныя адносіны з боку ВСНГ да выкананьня дырэктыў партыі ад падрыхтоўцы кадраў выступіўшы ў спрэчках тав. **Пятушкоў** даводзіў радам прыкладаў. Пры арганізацыі курсаў на 125 чалавек па падрыхтоўцы дырэктараў ВСНГ абмежаваўся толькі тым, што аддаў загад аб вылучэньні людзей на гэтыя курсы, а аб стварэньні адпаведных умоў для курсаў не паклапаціўся.

Пытаньні падрыхтоўкі кадраў, кваліфікацыі і перакваліфікацыі рабочай сілы, паляпшэньня рабочага забесьпячэньня неадлучны ад задач выкананьня плянаў сацыялістычнага будаўніцтва. Вынікі першых двух год пяцігодкі, рост актыўнасьці рабочай клясы поўнасьцю давялі рэальнасьць і магчымасьць выкананьня пяцігодкі за 4 гады. У гэтай справе надыходзячы год зьяўляецца рашаючым. На забесьпячэньне поўнага выкананьня прамфінпляну трэцяга году пяцігодкі па ўсіх паказальніках партыйная арганізацыя павінна аддаць усе сілы, бязьлітасна змагаючыся з апартунізмам.

У спрэчках па гэтым пытаньні выказаліся т.т.: **Міхайлаў, Кіршэнбэйн, Бінбут, Жукаў, Чарнышэвіч і інш.**

Склад кіруючых органаў Менскай гарадзкой парт'арганізацыі

**28 сьнежня вячэрнім пасяджэньнем скончыла сваю работу 1-я менская гарадзкая партканфэрэнцыя. У склад гаркому выбраны 73 члены і 19 кандыдатаў. Членамі выбраны т.т.: Аксючыц, Асаенак, Біга, Будзінскі, Бачароў, Балашоў, Вайчук, Гей, Галадзед, Грысевіч, Грышаеў, Грушнеўскі, Даморофскі, Дзічкоўскі, Дзяціна, Дунец, Дваранці, Дэйч, Жуковіч, Зантовіч, Іошпэ, Кавальчук, Каждан, Кумкес, Карначоў, Каппан, Кірылычык, Караеў, Кацман, Кац, Кантаровіч, Кіршэнблюм, Красік, Кнюкшто, Кохан, Колабкоў, Конюхаў, Крук, Лібзраў, Лішай, Лянько, Левін, Мароз,

Першарадная задача партыйных арганізацый—

У АТАКУ ЗА ЛЁН

У СТРОЙ

уступіў лёзьнянскі ільнаапрацоўчы завод

ТОЛЬКІ 14,8 проц. ПЛЯНУ ЗАГАТОВАК ІЛЬНАВАЛАКНА ВЫКАНАЛА БССР НА 25 СЬНЕЖНЯ

НОВУЮ ПЕРАМОГУ НА ФРОНЦЕ МЭХАНІЗАЦЫІ ІЛЬНАВОДЗТВА ЗАМАЦУЕМ І ПАШЫРЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ПЛЯНУ ЗАГАТОВАК ТЭХКУЛЬТУР І РАЗГОРТВАНЬНЕМ КАЛГАСНАГА РУХУ У ІЛЬНАВОДНЫХ РАЁНАХ

Адбыўся пуск Лёзьненскага заводу

ЛЁЗНА. 27 СЬНЕЖНЯ У ПРЫСУТНАСЬЦІ РАБОЧЫХ, КАЛГАСЬНІКАЎ І СЯЛЯН-АДЗІНААСОБНІКАЎ БЛІЖЭЙШЫХ ВЁСАК АДБЫЎСЯ УРАЧЫСТЫ ПУСК НОВАГА ІЛЬНААПРАЦОЎЧАГА ЗАВОДУ. ЗАВОДУ НАДАНА ІМЯ СТАРШЫНІ СНК СССР ТАВ. МОЛАТАВА. ПУСК ЗАВОДУ ДАЎ МАГЧЫМАСЬЦЬ ЗНАЧНА ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ У ПАРАЎНАНЬНІ З РУЧНЫМ СПОСАБАМ. ГАДАВАЯ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ЗАВОДУ — 230 ТОН ДОЎГАГА ВАЛАКНА № 17, 271 ТОНА КУДЗЕЛІ № 4 І 682 ТОНЫ КУДЗЕЛІ № 7.

УДАРНІКІ БУДАЎНІЦТВА ПРЭМІЯВАНЫ. ПАСЛАНЫ ПРЫВІТАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ ТАВ. МОЛАТАВУ, ЦК КП(б)Б І СНК БССР. АДКРЫНЬЦЁ ЗАВОДУ ВЫКЛІКАЛА ВЯЛІКІ ЗЪЗДЫМ СЯРОД УСІХ ПРАЦОЎНЫХ ЛЁЗЬНЕНСКАГА РАЁНУ, ШТО ЎЖО АДБІЛАСЯ НА ТЭМПАХ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ. НА 25 СЬНЕЖНЯ ЛЁЗЬНЕНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛЯН ЗАГАТОВАК ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР НА 48 ПРОЦ.

РАЙКОМ—АРАШЧУК.

Вынікі апартуністычнай практыкі

КРЫЧАЎ. (Наш кар.). Ільназагатоўкі па Крычаўскім раёне не пасунуліся наперад. Па ільнавалакне плян выкананы ўсяго на 4,5 проц., па ільнасемі—па 39,6 проц., па пяньцы—на 2,7 проц.

Каапэрацыйныя сыстэмы па-ранейшаму недаацэньваюць важнасьці ільназагатовак. **Стаўка на самацёк ня зьнішчана.**

Ёсьць паасобныя сельсаветы, дзе дагэтуль кулацка-заможным гаспадаркам ня даны цьвёрдыя заданьні. Некаторыя сельсаветчыкі лічаць, што «кулацка-заможныя гаспадаркі ня могуць выканаць заданьняў па ільне». Такая права-апартуністычная тэорыя і практыка, такое капітуляцкае патураньне кулаку ўжо адбілася на выніках ільназагатовак. У апошнюю пяцідзёўку ад кулацка-заможных гаспадарак не паступіла ні аднаго кілёграма ільну.

Некаторыя мясцовыя працаўнікі ставяць выкананьне ільназагатовак у залежнасьць выключна ад забесьпячэньня лыкам і іншымі прамтаварамі і гэтым самым прыкрываюць сваю бязьдзейнасьць.

Зрух адчуваецца толькі ў Сакольніцкім сельсавеце, які загатовіў 31 проц. пляну тэхкультур.

Бальшавіцкія тэмпы работы паказаў калгас «Чырвоны партызан», які апрацаваў увесь лён—24.000 снапоў. Лён здан дзяржаве.

Не распачата праца ў Зарубецкім сельсавеце, плян выкананы на 1 проц., па ільнавалакне. Дрэнна ідзе апрацоўка ільну ў калгасе «Перамога», Баеўскага сельсавету. Між іншым кіраўніцтва калгасу мае намер разьмеркаваць лён паміж калгаснікамі і нічога ня здаць дзяржаве. Кіраўніцтва калгасу «Перамога» ў сваёй рабоце не праводзіць выразнай клясавай лініі. Яно знаходзіцца пад уплывам кулацкіх элемэнтаў.

Сталь.

Прамтавары яшчэ не атрыманы

КРУПКІ. Па Крупскім раёне заданьне па ільназагатоўках выканана на 12,2 проц., ільнасемі — на 12 проц.

Многія калгасы толькі цяпер прыступілі да апрацоўкі ільну. Да апошняга часу раён не атрымліваў прамтавар для прэміяваньня адтачыкаў ільнавалакна. Для ўзмацненьня тэмпаў ільназагатовак да кожнага сельсавету прымацаваны ўпаўнаважаны ад каапэрацыі. Загатоўчыя органы вылучылі інструктароў па правядзеньні масавай работы па загатоўках.

На штурм прарываў

КРУГЛАЕ. На 26 сьнежня гадавы плян ільназагатовак па Круглянскім раёне выканан па валакне на 43,5 проц., па ільнаным семі на 83,5 проц. Райкаапсаюз выканаў свой плян па ільнавалакне на 50 проц. Значна горш ідуць загатоўкі па лініі спажывецкай каапэрацыі, якая загатовіла ўсяго 37 проц. заданьня.

З 23 сьнежня на Круглянскім раёне абвешчаны штурм прарываў у выкананьні загатовак ільну, хлеба, сена, лесаматэрыялаў і мабілізацыі фінансавых сродкаў.

Партыйная і камсамольская арганізацыі наладзілі паход у вёскі. Вылучаны брыгады, у іх прымаюць удзел каморнікі, аграномы, школьнікі і г. д. Д.

Ганебна адстаюць

ВОРША. Нераўному па ільназагатоўках па Аршанскім раёне ўсё яшчэ не дасягнута. Плян ільназагатовак выкананы на 20 сьнежня ўвогуле на 11,3 проц.

Значная частка партыйных, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый, галоўным чынам сельсаветы, не ўявілі сабе яшчэ ўсёй палітычнай важнасьці ільназагатовак і ня прымаюць энэргічных мер да іх фарсаваньня.

Найбольш ганебна адстаюць: Панізоўскі сельсавет, які выканаў заданьне на 0,5 проц., Рудкаўскі—2,1 проц., Краціенскі—2,2 проц., Кудзеўскі—4,7 проц.

Толькі 14,8 проц. па ільнавалакне!

Вестні аб ходзе ільназагатовак па БССР на 25 сьнежня сьведчаць, што пералому яшчэ не дасягнут.

ПЛЯН ЗАГАТОВАК на 25 сьнежня ПА ІЛЬНАВАЛАКНЕ ВЫКАНАН НА 14,8 проц., ПА ІЛЬНЯНЫМ СЕМІ—43,4 ПРОЦ., ПА ПЯНЬЦЫ—4,3 ПРОЦ. І ПА КАНОПЛЯХ—37,7 ПРОЦ.

Гэтыя лічбы яшчэ раз пацьвярджаюць, што раёны не мабілізавалі мас калгаснікаў і адзінаасобнікаў-бяднякоў і сераднякоў на правядзеньне ільназагатовак не ўявілі гэтай важнейшай кампаніі з первыбаркі саветаў.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПЕРАБУДОВУ РАБОТЫ КААПЭРАЦЫІ ПРЫСТАСОЎНА ДА НОВЫХ ЗАДАЧ РЭКАНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫЯДУ

«Пленум ЦК і ЦКК лічыць, што апарат каапэрацыі павінен быць ачышчан ад засеўшых у ім меншавіцкіх, эсэраўскіх і бюракратычных элемэнтаў, і пасьпна быць праведзена рашучая барацьба з апартунізмам у практычнай рабоце.»

(З пастановы пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)

Пытаньні рабочага забесьпячэньня, у першую чаргу мясам і гародніной, клясавае разьмеркаваньне спажывецкіх тавараў сярод рабочых і працоўных мас у даны перыяд набываюць надзвычай вялікае палітычнае значэньне. Камуністычная партыя на працягу ўсяго перыяду свайго змаганьня за перамогу сацыялізму пытаньням рабочага забесьпячэньня аддавала вялікую ўвагу і з вялікай чуласьцю адносілася да патрэб рабочае клясы, наўхільна папяпшаючы дабрабыт шырокіх пралетарскіх і працоўных мас. Гэта бачыць і адчувае кожны рабочы.

Толькі правыя апартуністы і двурушнікі з права-«лявацкага» блёку, скарыстоўваючы нашы труднасьці росту, гопасам клясава-варожых элемэнтаў узводзяць паклёпы на бальшавіцкую партыю. Рабочыя масы ведаюць цану гэтым паклёпніцкім бязглуздым абвінавачаньням. Рабочыя масы бязьлітасна выкрываюць апартуністаў розных колераў, з імі партыя вядзе самае жорсткае і бязьлітаснае змаганьне.

Пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), які нядаўна адбыўся, пытаньні рабочага забесьпячэньня і работы спажывецкай каапэрацыі паставіў у цэнтр увагі ўсяе партыі. Пленум прызнаў работу Наркамснабу па лініі Саюзмяса і Саюзплодагародніны нездавальняючай. Нездавальняючай пленум прызнаў і работу Цэнтрасаюзу, а таксама органаў спажывецкай каапэрацыі на мясцох. Адначасова ў сваёй пастанове пленум падкрэсьліў, што «СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ НЕ ПЕРАБУДАВАЛАСЯ ПРЫСТАСОЎНА ДА НОВЫХ ЗАДАЧ РЭКАНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫЯДУ».

Пастановы пленуму па пытаньнях забесьпячэньня мясам і гародніной, а таксама па рабоце спажывецкай каапэрацыі ставяць рад важнейшых задач перад усімі раённымі партарганізацыямі і ў першую чаргу перад партыйнымі ячэйкамі, якія абслугоўваюць каапэрацыйныя арганізацыі. Да гэтага часу партыйныя ячэйкі каапэрацыйных устаноў і арганізацый надзвычай дрэнна кіравалі работай каапэрацыйных арганізацый. Слаба кіравалі работай апошніх і некаторыя райпартарганізацыі. Іменна ў сувязі з гэтым у радзе каапэрацыйных арганізацый мела месца апартуністычная практыка, да гэтага часу ў спажывецкай каапэрацыі ёсьць напўнасьць «кнейнага нэпманскага духу» ў рабоце, элемэнты семацёку, бюракратызму і апартунізму на практыцы, што прыводзяць да затаварваньня ва ўмовах дэфіцытнасьці тавараў, засьмечаньня апарату чужымі, а таксама шкоднымі элемэнтамі, слабасьць работы па арганізацыі і нападжаньні справы грамадзкага харчаваньня, слабы ўдзел каапэраваных мас спажыўцоў у кантролі і кіраўніцтве спажывецкай каапэрацыі і адсутнасьці разгорнутай самакрытыкі. (З паст. пленуму ЦК)

Усе гэтыя недахопы, на якія надзвычай выразна паказаў пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), зьявіліся ў рэзультаце таго, што партыйныя ячэйкі і партыйныя арганізацыі на мясцох не ўзялі бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце, не перабудавалі яе ў адпаведнасьці з палітычнымі задачамі партыі.

Такога становішча далей цярпець нельга. Партыйныя арганізацыі і ячэйкі каапэрацыйных устаноў у першую чаргу павінны неадкладна мабілізаваць масы вакол тых задач, якія пастаўлены пленумам. Па-першае, самым жорсткім парадкам трэба АЧЫСЬЦІЦЬ каапэрацыйны апарат ад эсэраўскіх, розных клясава-варожых і сацыяльна-чужых элемэнтаў. Варта толькі ўважліва прыгледзецца, як мы ў нашых умовах у каапэрацыйных арганізацыях знойдзем шмат сацыяльна - чужых элемэнтаў, шмат бундаўцаў і інш. хламу, які ні ў якім разе ня можа быць пакінут на адказнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва. Узмоцніць партыйнае кіраўніцтва каапэрацыяй — першачарговая і галоўная задача партыйных арганізацый.

Другое пытаньне — перабудова работы каапэрацыйных арганізацый. У данай галіне перад ячэйкамі стаіць задача — дабіцца абсалютнай гібкасьці і паваротлівасьці ў рабоце каапэрацыйных органаў. Бюракратызм, цяганіну, закасьцянеласьць трэба бязьлітасна вытруціць. Бо часамі мы сустракаемся з такімі фактамі, калі нізавыя каапэрацыйныя зьвяны надзвычай марудзяць з выкананьнем тэй ці іншай дырэктывы партыі. Работа каапэрацыйных арганізацый зьверху і да нізу павінна быць падначалена задачам рэканструкцыйнага пэрыяду.

За апошні пэрыяд даволі шпарка разьвіцьцё атрымалі новыя формы клясавага разьмеркаваньня тавараў. Іх уся мерна трэба яшчэ больш разгортваць, сачыць за тым, каб яны працавалі сапраўды па-баявому, каб яны, як магчыма, абслугоўвалі рабочага-спажыўца. Партыйным ячэйкам трэба праз заслухоўваньне дакладаў партыйцаў, якія працуюць у закрытых разьмеркавальніках, дабівацца належнай пастаноўкі работы апошніх.

Работа разьмеркавальнікаў у даны пэрыяд набывае асабліва важнае значэньне. Таму вакол пытаньня забесьпячэньня іх адпаведнымі кадрамі працаўнікоў з рабочых і клясава-вытрыманых элемэнтаў трэба мабілізаваць увагу партыйных і рабочых мас.

За апошні час у радзе месц заўважана затаварваньне. Гэта недапушчальнае зьявішча падрывае справу рабочага забесьпячэньня таварамі спажываньня. Таму ў задачы ячэек уваходзіць—уважліва сачыць за тым, каб тавары як можна ў карацейшы тэрмін даходзілі ад фабрыкі, дзе яны вырабляюцца, да каапэрацыйнай крамы, да рабочага спажыўца.

Грамадзкае харчаваньне — актуальнейшая праблема сёньняшняга дня. У гэтай галіне трэба прыкласьці шмат сіл, каб паставіць грамадзкае харчаваньне на тую вышыню, на якую яно павінна быць пастаўлена. Пры радзе становак ёсьць партыйныя ячэйкі. Раённыя партарганізацыі павінны заразжа зацікавіцца работай гэтых ячэек, праверыць, як яны змагаюцца за шырокі ахоп рабочых і працоўных мас грамадзкім харчаваньнем.

Усе гэтыя пытаньні ёсьць толькі невялікая частка таго, тых вялізарных задач, якія паставіў перад партыйнымі арганізацыямі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Мабілізуючы шырокія рабочыя масы, масы калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў, партыйныя арганізацыі павінны ў цэнтр сваёй увагі паставіць пытаньні ўзмацненьня каапэрацыйнай сеткі на весцы, арганізацыі прыгарадных жывёлагадоўчых і агародных гаспадарак, поўнага выкананьня фінансавых планаў і г. д.

Толькі ў бязьлітасным змаганьні супроць правых і «левых» апартуністаў, толькі на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, партыйныя ячэйкі змогуць дабіцца поўнага выкананьня тых задач партыі, якія пастаўлены перад трэцім годам пяцігодкі.

Кінутыя на волю лёсу

Чэрыкаўскае спажывецкае таварыства арганізавала сьвінагадоўчую гаспадарку. Гэта гаспадарка ўкамплектавана 200 шт. сьвіней і парасят. На сёньняшні дзень гаспадарка знаходзіцца ў надзвычай дрэнным становішчы. Ні партыйныя арганізацыі, ні адпаведныя савецкія органы не пацікавіліся, у якім становішчы і як працце гаспадарка.

Усю работу там вядуць дзьве работніцы, якія ня маюць ні спэцвопраткі, ні выхадных дзён, ні адпаведнай падрыхтоўкі. Ўмовамі іх работы ніхто не пацікавіўся. Справіцца са сваімі абавязкамі яны ня могуць. Ім патрэбна дапамога.

У сувязі з тым, што ў радзе выпадкаў сьвіньням давалі кідобранасчыя харчы, сьвіньні дохнуць.

Раённыя партарганізацыі і фракцыя праўленьня спажывецкага таварыства павінны неадкладна зацікавіцца становішчам гаспадаркі і вінаватых у дрэннай пастаноўцы там работы прыцягнуць да суровай адказнасьці. М.

З-га студзеня ў чырвонай сталіцы СССР—Маскве пачынаецца „Тыдзень Савецкай Беларусі"

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ „ТЫДНЮ"

(Гутарка з загадчыкам аддзелу культуры і прапаганды Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, старшынёю дэлегацыі БССР тав. А. Чарнушэвічам)

Пралетарская грамадзкасьць зараз рыхтуецца да правядзеньня «тыдню Савецкай Беларусі» ў Маскве. Зразумела, што арганізацыя «тыдню» патрабуе пільнае ўвагі і ня малае работы з боку нашых партыйных, прафэсыянальных, камсамольскіх, гаспадарчых і культурных устаноў і арганізацый.

Тры задачы зьяўляюцца асноўнымі ў справе правядзеньня «тыдню Савецкай Беларусі» ў Маскве.

Першая з іх — **папулярызацыя культурных і гаспадарчых дасягненьняў БССР.** У часе «тыдню» рабочая клясa БССР, калгаснік і бядняцка-серадняцкія масы БССР праз друк, тэатр, кіно, праз сваіх дэлегатаў павінны будуць паказаць, як яны, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і пры дапамозе пралетараў усяго Савецкага Саюзу, ажыцьцяўляюць сацыялістычнае будаўніцтва. Гэты паказ дасягненьняў БССР, які будзе дэманстравацца перад тварам усяго Савецкага Саюзу, павінен будзе навочна паказаць, што гэтыя дасягненьні намі атрыманы ў бязьлітаснай барацьбе з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, у рашучай барацьбе з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» загібамі, з права-«лявацкімі» блёкам, у рашучай барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам — галоўнай небясьпекай, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал - дэмакратызмам, агентурай і сазэшнікам польскага фашызму, у барацьбе супроць шавінізмаў усіх колераў.

У дні «тыдню» мы паказжам, як замест вузкапалосься і азяяднаных хутароў, замест дробных саматужных арцеляй — ствараюцца калгасы і саўгасы, растуць новыя буйныя сацыялістычныя фабрыкі і заводы і электрастанцыі, адкрываюцца працоўныя школы, унівэрсітэты, праводзіцца ўсеагульнае навучаньне, політэхнізацыя школы, расьцьвітае пралетарская культура — «нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьмесьце».

Паказ і папулярызацыя дасягненьняў Савецкай Беларусі павінны **з асаблівай выразнасьцю адлюстраваць вялізарную дапамогу, якую атрымлівае БССР ад пралетарыяту Савецкага Саюзу, неадлучнай часткай якога яна зьяўляецца.**

Калі мы гаворым пра Савецкую Беларусь, мы заўсёды ўспамінаем братоў па клясе, — прыгнечаных рабочых і сялян Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Польскі фашызм, пры дапамозе беларускіх і украінскіх надсьпінал-фашыстаў, прабуе задушыць рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Праз калёнізацыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны асадчыкамі, праз падтрыманьне беларускага кулацтва, — польскія фашысты імкнуцца ўзмацніць свой тыл.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, якая знаходзіцца на мяжы з капіталістычным сьветам, зьяўляецца загартаваным аванпостам Савецкага Саюзу.

Паказы дасягненьняў сацбудаўніцтва Савецкай Беларусі і «вынікаў» панаваньня польскага фашызму ў Заходняй Беларусі, выкрыцьцё шаленай падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу і зьяўляецца трэцяй асноўнай задачай «тыдню».

У часе тыдню трэба яшчэ больш мабілізаваць увагу да справы ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны сацыялізму. На спробы інтэрвэнтаў і іх агентаў — Рамэйных, Ларчавых, Ластоўскіх і Лёсікаў, якія падрыхтоўвалі новую крывавую вайну, працоўныя БССР яшчэ больш узмацняюць барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі, тэтым самым узмацняючы абароназдольнасьць Савецкай краіны.

Якая падрыхтоўчая работа ўжо зроблена да «тыдню Савецкай Беларусі» ў Маскве?

Падрыхтоўка ідзе праз камітэт па арганізацыі «тыдню» ў Маскве і праз адпаведную камісію ў Менску. Як камітэтам, так і камісіяй падрыхтавана да друку брашура аб культурным будаўніцтве, сельскай гаспадарцы і прамысловасьці Савецкай Беларусі. Таксама падрыхтаваны выстаўкі: 1) гаспадарчых дасягненьняў; 2) культурнага будаўніцтва; 3) кніжная, з галоўным аддзелам; 4) вынаходніцтва мастацтва; 5) становішча Заходняй Беларусі і Беларусі ў часе грамадзянскай вайны. На час тыдню ў Маскву выяжджаюць Першы беларускі, польскі, яўрэйскі тэатры, беларуская і яўрэйская капэлы, ансамбль народных інструментаў і інш. Падрыхтаваны да выезду ў Маскву і рабочыя гурткі самадзейнасьці.

Камісія па арганізацыі «тыдню БССР» у Маскве зацьверджана сьпіс тэм і дакладчыкаў у Маскве па розных галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва БССР. У склад дэлегацыі БССР, якая выяжджае ў Маскву, вылучаны 17 ударнікаў-рабочых, 10 калгаснікаў, 3 настаўнікі, 3 навуковых работнікі, 17 пісьменьнікаў, 1 дырэктар фабрыкі, загадчык саўгасу, кіраўнік машына-трактарнай станцыі, аграном, інжынэр.

У Маскве ідзе вялікая падрыхтоўчая работа на прыёме дэлегацыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Масква, па час «тыдню БССР», будзе ўпрыгожана спэцыяльнымі лёзунгамі, дыяграмамі, плякатамі, вітрынамі фотаздымкаў і г. д.

Да недахопаў трэба аднесьці тое, што друк БССР вельмі слаба, недазвольнічна асьвятляе падрыхтоўку да «тыдню».

Рэдакцыі цэнтральных, раённых, фабрычна-заводзкіх і калгасных газэт павінны безадкладна пераключыцца на мабілізацыю ўвагі пралетарскай грамадзкасьці БССР да «тыдня» які зьяўляецца адказьнейшым палітычным мерапрыемствам.

Мабілізуючы ўсю масу рабкораў і селькораў, газэты павінны завесьці сталыя, штодзённыя аддзелы, прысьвечаныя, як падрыхтоўцы, так і самому правядзеньня «тыдню».

Засталося некалькі дзён. Яны павінны быць поўнасьцю скарыстаны для энэргічнай і настойлівай падрыхтоўкі БССР да выкананьня і папулярызацыі гэтай палітычнай задачы.

НАСУСТРАЧ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ

ПА НАСЕНФОНДАХ

заданьне выканана толькі на 27,2 проц.

РАМОНТ

не арганізаваны ні аднэй с.-г. арганізацыяй

БССР ГАНЕБНА АДСТАЕ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ

Мабілізацыяй мас, пераключэньнем зямельна-калгасных органаў на баявую і выразную работу, змаганьнем з праваапартуністычнай стаўкай на самацёк і „чарговасьцю" кампаніі даб'емся сваячасовага выкананьня кантрольных заданьняў другой калгаснай вясны

Барацьба за праграму бальшавіцкай вясны—барацьба за калектывізацыю

Весткі з месц і даныя зводак малюць ганебнае адставаньне БССР у разгортваньні падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Даволі сказаць, што на сёньняшні дзень ні МТС, ні саўгасы яшчэ не прыступілі да рамонту трактараў і с.-г. машын. Бязьдзейнасьць у гэтых адносінах пагражае зрывам рамонтнай кампаніі—асноўнага звяна ў падрыхтоўцы да сяўбы на сёньняшні дзень. Гэта пацьвярджаецца хаця-б наступнымі фактамі. Рамонтныя майстэрні ўсё яшчэ не адкрыты. Ніякіх мер да забесьпячэньня іх запаснымі часткамі ня прынята. Машыны па ачыстцы збожжа ў радзе раёнаў не скарыстоўваюцца, бо яны не адрамантаваны дый рамантаваць іх яшчэ нават не пачыналі.

Саюзны Наркамзем даў цьвёрдую дырэктыву, паводле якое БССР павінна скончыць рамонт 75 проц. трактараў да 1-га сакавіка 1931 г. Сучасны тэмп рамонтнай кампаніі зусім не забесьпечвае сваячасовага выкананьня гэтай пастановы.

Ня дешт стаіць справа з ажыцьцяўленьнем першачарговай задачы—засыпкі насенных фондаў у калгасах. Зводка, якую мы сёньня друкуем, гаворыць аб агідных адносінах большасьці раёнаў да справы стварэньня насенных фондаў. Адсутнасьць вестак ад 45 раёнаў сьведчыць, што амаль у палове раёнаў гэта работа зусім не разгарнулася. Пастанова ўраду БССР прадугледжвае абавязковае скончэньне засыпкі насенных фондаў у асноўных калгасах не позьней 1-га студзеня. Між тым, на 25 студзеня 55 раёнаў выканалі свае заданьне ўсяго на 27,2 проц. Прычым рад раёнаў зусім злачынна адстае. Так, Чэрыкаўскі, Буда-Кашалёўскі, Асьвейскі і Бягомльскі раёны далі ад 1,6 да 3,4 проц. выкананьня заданьня.

Агульнае адставаньне ў стварэньні насенных фондаў і адначасовай ачыстцы насеньня тлумачыцца, галоўным чынам тым, што мясцовыя арганізацыі не ўяўляюць сабе ўсяе важнасьці неадкладнага выкананьня гэтага мерапрыемства, пічачы, што «яшчэ ёсьць час, расьпраемся». У сувязі гэтага становішча працуючыя бязьдзейнасьць мясцовых працаўнікоў у галіне мабілізацыі мас калгаснікаў, адзінаасобнікаў беднякоў і сераднякоў на ажыцьцяўленьне важнейшых мерапрыемстваў да веснавой сяўбы. Трэба адзначыць таксама, што засыпку насенных фондаў затрымлівае слабы ход абмалоту ў калгасах. Належныя меры да ўзмацненьня тэмпу абмалоту пакуль што ня прыняты.

Бясспрэчна, што ігнараваньне разгортваньня асноўных у сучасны момант мерапрыемстваў—рамонт, засыпка насенных фондаў, збожжачыстка, складаньне калгасна-вытворчых планаў — тлумачыцца ў значнай меры самацёчнымі настрэмі і стаўкай на «чарговасьць» кампаніі радам мясцовых арганізацый і работнікаў. Канкрэтна гэта азначае, што ў радзе раёнаў усе сілы зараз кінуты на перавыбарчую кампанію саветаў, прычым важнейшая задача — падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны—ня ўлічваецца з первыбарамі саветаў.

Значнае павялічэньне ўдзельнае вагі калгасаў і саўгасаў і вопыт, які імі ўжо накоплен, даю поўную магчымасьць забясьпечыць выкананьне асобных мерапрыемстваў падрыхтоўкі веснавой сяўбы ў дакладна вызначаныя тэрміны. Гэтыя тэрміны, вызначаныя ўрадам, патрэбна для таго, каб можна было сваячасова выканаць усе мерапрыемствы і тым самым забясьпечыць выкананьне пляну самой сяўбы ў мінімальна кароткі тэрмін. Гэта дасьць магчымасьць унікнуць памылак веснавой і всенняй кампаніі мінулага году.

Рэальнасьць вызначаных тэрмінаў ярка даказваецца наступнымі фактамі. Заходняя вобласьць ужо пасьпела давесьці пляны і арганізаваць іх абмеркаваньне ў 80 проц. калгасаў. Паўночны Каўказ ужо сабраў больш 2/3 насенных фондаў, Башкірская рэспубліка адрамантавала больш паловы трактарнага парку.

БССР можа і павінна раўняцца па гэтых вобласьцях і рэспубліках. Асноўныя зьвены падрыхтоўкі да сяўбы павінны стаць у цэнтры ўвагі мясцовых арганізацый, мас калгаснікаў і адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў. Рамонтную кампанію трэба неадкладна разгарнуць па ўсіх сыстэмах, бязьлітасна змагаючыся са злачынным бязьдзейнасьцю паасобных гаспадарчых арганізацый і работнікаў, з усялякімі спробамі затармазіць скончэньне будаўніцтва рамонтных майстэрань. Трэба падкрэсьліць, што рамонтная кампанія пройдзе з посьпехам толькі пры ўмове сапраўднай мабілізацыі ўсіх мясцовых рэсурсаў (збор жалеза, старых частак) і жорсткай эканоміі ў выдаткаваньні рамонтных матар'ялаў і запасных частак.

Трэба цьвёрда памятаць, што барацьба за выкананьне пляну калектывізацыі, ад чаго галоўным чынам, залежыць посьпех другой бальшавіцкай сяўбы, ёсьць перш за ўсё барацьба за найбольш выразную падрыхтоўку асобных элемэнтаў веснавой сяўбы. Самая рашучая барацьба павінна весьціся з праваапартуністычнымі спрабамі адарваць барацьбу за калектывізацыю новых сотэнь тысяч адзінаасобнікаў ад важнейшых гаспадарчых мерапрыемстваў. Нарастаньне калгаснага руху будзе вызначацца далейшым разгорнутым паказам вынікаў калгаснага будаўніцтва, няўхільным узмацненьнем і павышэньнем якасьці падрыхтоўкі да сяўбы, узмацненьнем наступленьня на кулака. Толькі арганічная ўвязка падрыхтоўкі да вясны, паказу вынікаў калгаснай працы з арганізацыяй новага прыліву дасьць нам належныя вынікі другой бальшавіцкай вясны. Толькі арганізацыяй мас на барацьбу з кулаком, бязьлітасным змаганьнем з яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі—можна і трэба выканаць тыя вялізарныя задачы, якія высунула партыя ў сувязі з надыходзячай веснавой сяўбой.

Рамонт сартыроўкі.

Тэмп засыпкі насенных фондаў зусім нездавальняючы

Ня гледзячы на катэгарычны дырэктывы Наркамзему і Калгасцэнтру, большасьць раёнаў упарта не дае вестак аб ходзе засыпкі насеньня ў калгасах. Гэта не дае магчымасьці ўявіць сабе дакладны малюнак ажыцьцяўленьня такога важнейшага мерапрыемства, як стварэньне насенных фондаў.

НА 25-га СЬНЕЖНЯ ВЕСТКІ АТРЫМАНЫ ТОЛЬКІ АД 55 РАЙКАЛГАССАЮЗАЎ. Па гэтых раёнах павінна быць да 1-га студзеня засыпана ў калгасах 413.766 цэнтн. насеньня яравых. ЗАСЫПАНА ТОЛЬКІ 112.691 ЦЭНТН.—27.2 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

УПЕРАДЗЕ—Сеньненскі раён, які выканаў 78,5 проц. пляну, Лельчыцкі—57 проц. і Любаньскі—64,8 проц.

ГАНЕБНА АДСТАЮЦЬ: Чэрыкаўскі раён, які даў 1,6 проц. заданьня, Буда-Кашалёўскі—1,7 проц., Асьвейскі—3,4 проц., Бягомльскі—3,4 проц.

Складаны рамонт не распачаты

Рамонт трактараў і с.-г. машын да гэтага часу ўсё яшчэ не разгорнут.

Тэмп работы вытворчых арганізацый зусім не адпавядае правядзеньню рамонту ў тэрмін, які ўстаноўлен для БССР Саюзным Наркамземам.

Агідную бязьдзейнасьць праяўляе Трактарацэнтр. Да гэтага часу беларускае аддзяленьне Трактарацэнтру не закончыла прыёмкі трактарных майстэрань і абсталяваньне ад Белкалгасцэнтру. Ня ўсе майстэрні дабудаваны, абсталяваны і ўкамплектаваны адпаведным персаналам і кваліфікаванымі рабочымі.

Ні ў аднэй арганізацыі няма нават прыблізнага падліку колькасьці папсаваных трактараў і с.-г. машын. Тэхнічная дапамога калгасам і саўгасам з боку Трактарацэнтру адсутнічае. Такія адносіны з боку арганізацыі якой даручана правядзеньне складанага рамонту трактараў усяго сацыялістычнага сэктару, ставіць пад пагрозу арыву ўсю рамонтную кампанію.

Амаль усе сельска-гаспадарчыя арганізацыі недаацэньваюць значэньня сваячасовага рамонту. Паміж майстэрнямі і тэрмальнікамі машын адсутнічае дагаворанасьць. Райвыканком і райзаг ня прымаюць амаль ніякага ўдзелу ў арганізацыі рамонту. Усё яшчэ нічога на зроблена для прыцягненьня чыгуначных і прамысловых майстэрань да рамонту с.-г. машын.

Белсельтрэст затрымлівае ў сваёй майстэрні рамонт такарнага варштату, ад якога залежыць пуск аршанскіх рамонтных майстэрань. Саўгас Межава не перакідвае ў Воршу абсталяваньне, якое стаіць у яго без карысьці. Бяз гэтага абсталяваньня нельга пусьціць с.-г. майстэрні аршанскага прамкамбінату.

А.

Пачынаньне менскіх асьветнікаў

Бюро парт'ячэйкі працаўнікоў асьветы гор. Менску выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва па правядзеньні другой бальшавіцкай вясны парт'ячэйку работнікаў асьветы Віцебску і Гомелю.

Асьветнікі Менску бяруць на сябе абавязак да 10 студзеня напісаць брашуру аб удзеле асьветніцкай масы ў веснавой кампаніі. Да 15 красавіка асьветнікі абавязваюцца сабраць 2.500 руб. у фонд трактарнай калёны. На працягу красавіка-мая месяцаў асьветнікі Менску арганізуюць брыгаду з 50 чалавек па аказаньні практычнай дапамогі калгасам і саўгасам. Для падрыхтоўкі ўдарнай брыгады арганізуюцца спэцыяльныя курсы.

Асьветнікі распрацоўваюць мэтадычны арганізацыйны ліст аб удзеле ў пасеўнай кампаніі ўсіх школ і дзіячых садоў Менску. Гэта работа павінна быць скончана да 15 студзеня.

Вясковым мясцкомам і групкомам працасьветы праз пісьмовую сувязь і выезды на месцы будзе аказана практычная дапамога ў правядзеньні кампаніі.

З 1 лютага па 30 сакавіка асьветнікі арганізуюць 2-х месячныя курсы калгасных арганізатараў на 50 чалавек.

Сьпячка

КОПЫСЬ. Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў Копыскім раёне праходзіць марудна. Пляны сяўбы ня складзены. Заданьне аб папырэньні пасеўнай плошчы не даведзена да калгасаў і сельсаветаў.

Насенфонды па сельсаветах ня створаны. Малацьба і ачыстка насеньня па калгасах і па адзінаасобных гаспадарках дагэтуль яшчэ не разгорнута.

А. Генкін.

Самацёк

ХАЛОПЕНІЧЫ. Да ачысткі і сартыроўкі насеньня ў Халопеніцкім раёне ня прыступлена. Сельска-гаспадарчыя машыны знаходзяцца ў бяспрытульным становішчы.

У апошні час у калгасы ўлілося каля 100 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Але арганізацыяй прыліву і новых калг

КАДРЫ—ТРЭЦЯМУ ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

ЗАМАЦАВАНЬНЕ—

АСНОЎНЫ МЭТАД БАРАЦЬБЫ З ЦЯКУЧАСЬЦЮ. ЖОРСТКА КАРАЦЬ ПРАГУЛЬШЧЫКАЎ І ЛЯТУНОЎ, ЯНЫ ЗРЫВАЮЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

Адзін з ініцыятараў плянава-апэрацыйных груп, лепшы ўдарнік заводу «Камунар» т. Фрыдман.

Пакласьці канец

недаацэнцы барацьбы з цякучасьцю

На шмат якіх прадпрыемствах пытаньне аб забесьпячэньні рабочай сілай стаіць вельмі востра. На заводах **«Камунар»**, **«Ударнік»**, (Менск) **«Пралетары»** (Гомель), у друкарні **імя Сталіна** шмат варштатаў не выкарыстоўваюцца з-за недахвату рабочай сілы. Тым ня менш, на гэтых прадпрыемствах **падрыхтоўцы кадраў і барацьбе з цякучасьцю аддаюцца зусім мала ўвагі.**

Цякучасьць рэзка адбіваецца на выкананьні прамфінпляну. Яркі прыклад — становішча на заводзе **«Ударнік»** (Менск). За кастрычнік на завод прынята 34 рабочых, звольнілася за гэты час 38 рабочых, сярод іх 19 кваліфікаваных. За лістапад прынята 36 рабочых, звольнілася 13, з іх 5 кваліфікаваных. За адну палову сьнежня прынята 39 рабочых, пакінула завод 17, з іх 4 кваліфікаваныя. Наогул абнаўленьне рабочага штату заводу складае каля **22 проц.**

На заводзе **«Энэргія»** за 1929-30 год было прынята 1.541 чалавек, пакінула завод 1.106 чалавек. Усяго-ж на заводзе 1.190 рабочых. Такім чынам, пякучасьць за год складае амаль **100 проц. Ударны квартал на «Энэргіі» ня даў перапому.** За кастрычнік і лістапад было прынята 261 рабочы, **пакінула завод 184.**

Трэба адзначыць, што цякучасьць назіраецца галоўным чынам сярод **моладзі.**

Яны барацьба вядзецца з цякучасьцю рабіцца? Асноўны мэтад барацьбы з цякучасьцю — гэта **растлумачальная работа, мабілізацыя грамадзкай думкі супроць пятуноў і дэзэртыраў працоўнага фронту.** Верасьнеўская адозва ЦК УсеКП(б) узьняла хвалю актыўнасьці рабочай клясы, пашырыла **самазамацаваньне** на прадпрыемствах да канца пяцігодкі. Самазамацаваньне на многіх прадпрыемствах ахапіла вялікую колькасьць рабочых. І, трэба сказаць, **што гэты новы мэтад барацьбы з цякучасьцю** прывёў да вельмі дадатніх вынікаў. З ліку тых рабочых, якія самазамацаваліся да канца пяцігодкі, ня было ніяк ні аднаго, які-б парушыў сваё самаабавязацельства і пакінуў завод.

Тым ня менш на радзе прадпрыемстваў заводзкія арганізацыі **недаацэньваюць значэньня самакантрактацыі і не вядуць ніякай растлумачальнай работы сярод рашты рабочых, якія засталіся пазэ гэтым рухам.**

Так, на заводзе «Энэргія» колькасьць самазакантрактаваных рабочых складае ўсяго 685 чалавек (на 1-XII). На «Бальшавіку» самазакантрактавалася толькі 60 проц. рабочых і г. д.

Недаацэнка барацьбы з цякучасьцю зьяўляецца тым больш недапушчальнай, што і ў справе падрыхтоўкі новых кадраў ня ўсё добра. Заводу «Энэргія», напрыклад, на 1931 год патрэбна будзе арыентовачна 450 новых рабочых. Праўда, на заводзе кваліфікуецца 120 чалавек, існуе фабзавуч на 40 чалавек. Гэтымі днямі на завод прыедуць 25 сьлесароў і токараў з клімавіцкай прафшколы. Але ўсе гэтыя крыніцы не пакрыюць недахвату ў рабочай сіле. Некаторую дапамогу дасьць інстытут інструктароў для навучаньня новых рабочых. Кожнаму інструктару даручана падрыхтаваць ня менш 10-ці чалавек. Горш стаіць справа з атрыманьнем кваліфікаванай рабочай сілы. Менскія органы працы яе ня маюць.

Але завод «Энэргія» ў гэтым сэнсе сёе-тое робіць. Горш на іншых прадпрыемствах, напрыклад, на «Камунары», дзе на другой і трэцяй зьменах працуюць ня ўсе варштаты выключна з-за таго, што не хапае рабочай сілы.

Гэта яшчэ больш абастрае пытаньне аб неабходнасьці ўзмацніць барацьбу з цякучасьцю, **шырэй разгарнуць кампанію самакантрактацыі, трымаючы курс на поўныахоп самаабавязацельствамі рабочых прадпрыемстваў.**

РУБІН.

На завод «Полымя рэвалюцыі» з новага гаспадарчага году пачнуцца вытворчыя манэўры. У сувязі з гэтым арганізаваны баявы штаб па падрыхтоўцы да манэўраў і па праверцы выкананьня прамфінпляну за ўдарны квартал.

На здымку: штаб за работай.

„ЗРОБІМ“

Падрыхтоўцы рабочых кадраў на папяровай фабрыцы «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» (Чашнікі) аддаецца вельмі мала ўвагі. У нас існуюць толькі прафтэхкурсы, але і тыя пакінуты на волю лёсу. Калі загадчык прафтэхкурсаў зварачаецца да дырэктара фебрыкі з просьбай скласьці адпаведныя ўмовы для заняткаў, ён атрымлівае адзін адказ: «Зробім». Але, вядома, што абяцанкі — цацанкі. Прайшло больш за 2 месяцы ад першага абяцаньня, а нічога яшчэ ня зроблена. Таму заняткі прафтэхкурсаў знаходзяцца пад пагрозай зрыву.

Тое самае адносна бронь-падросткаў. Некаторыя падросткі ня маюць ні адзеньня, ні абутку, ні кватэр і прымушаны начаваць у клюбе, сталовай, або чакальні.

Такім апартуністычным адносінам да падрыхтоўкі кадраў трэба пакласьці канец.

Невядомы.

5.400 рабочых

ня хопіць Бабруйску

1931 год прад'яўляе да нас вялікія запатрабаваньні ў справе падрыхтоўкі рабочай сілы. Возьмем Бабруйскі раён. Паводле пяцёхгодкі, адным толькі будаўнічым арганізацыям патрэбна будзе 14.700 рабочых. А ёсьць усяго 9.274. Ня хопіць, такім чынам, звыш 5.400 рабочых.

У галіне падрыхтоўкі рабочых кадраў сёе-тое робіцца. Праз курсы ЦПІ мяркуецца падрыхтаваць 1.200 цесляроў, сталяроў, мулярыў, штукатураў і каменшчыкаў. Па лініі дарожнага будаўніцтва таксама адкрыта школа вучнёўства. Але гэтага ўсё-ж мала. Арганізацыі далі заяўкі кіраўніцтву кадрамі, кіраўніцтва спадзяецца на завод рабочай сілы з іншых раёнаў. А будаўнічая кантора Белжылсаюзу і аддзяленьне Белкалгасбуду зусім не далі заявак на патрэбную ім рабочую сілу. Не дапамаглі і нашамінаньні кіраўніцтва кадрамі.

Цяпер адносна нашых прадпрыемстваў. Найбольшыя запатрабаваньні на рабочую сілу прад'яўляюць цагельні, для якіх ня хопіць прыблізна 200 чалавек. Ня хопіць рабочых машынабудаўнічаму заводу, камбінаванай фабрыцы, якім больш за ўсё патрэбны будуць сьлесары, токары. Праўда, частку гэтых рабочых дасьць прафшкола мэталістаў, але пэўнай часткі ўсё-ж ня хопіць. Аб падрыхтоўцы кадраў на гэтых прадпрыемствах ня думаюць. Брыгадная вучнёўства ня створана. Усе спадзяюцца на «добрага дзядзю»—кіраўніцтва кадрамі.

Наогул трэба адзначыць, што на прадпрыемствах Бабруйску за падрыхтоўку кадраў як належыць не ўзяліся.

А.

Тав. Дзецкі зрабіў па-дзецку

Рабочы гомельскага заводу імя Лапцуцкага, электраманцёр электрастанцыі — Канашонак Л. на працягу двух год вучыўся ў гомельскім чыгуначным тэхнікуме. Два гады заводакіраўніцтва акуратна аслабаняла яго ад работы ў цэху на дзьве гадзіны штодзенна, спадзяючыся, што з яго выйдзе добры кадравік, які дасьць заводу шмат карысьці. Аказалася наадварот. Тав. Канашонак раптам бяз усякай прычыны кінуў вучобу. А як на гэта рэагаваў заг. культпрогу парткому тав. Дзецкі? Ну што-ж, калі ты ня хочаш вучыцца, дык мы цябе рэкамэндуем агульнаму сходу цэху ў сакратары цэх'ячэйкі. Так яно і было. Тав. Канашонак зараз зьяўляецца сакратаром, хаця рабочыя і давалі адвод.

Па прыкладзе Канашонка кінуў вучыцца і беспартыйны рабочы тав. Сідарэнка.

Рабочыя нашага цэху, ведаючы, што я рабкор, папрасілі, каб я напісаў у «Зьвязду», бо мясцовыя органы на гэта слаба рэагуюць.

Спадзяюся, што цэнтральныя органы дадуць пэўную ўстаноўку.

Ваня.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы лічым, што тав. Дзецкі паступіў няправільна, патураючы дэзэртырству з фронту вучобы.

„Дапамога“ Наркампрацы

На дражджавым заводзе «Чырвоная зара» (Менск) са 160 рабочых і служачых самазамацавалі сябе да канца пяцігодкі 75 чалавек, або 47 проц. Для самазамацаваньня рэшты рабочых ніякай працы амаль не вядзецца. У сувязі з гэтым, за апошні час на заводзе назіраюцца выпадкі самавольнага ўходу з заводу. Так, кядаўна пакінулі завод квасільшчык Адзюкевіч, Одэр, сэпаратарышчык Русальскі і іншыя. Таксама слаба пастаўлена растлумачальна-выхаваўчая работа сярод новых рабочых, галоўным чынам, выхадцаў з вёскі.

Прымаючы цал увагу, што паводле пляну на 1931 год, штат заводу павінен быць павялічан на 120 чалавек, або на 75 проц., трэба было-б зьвярнуць больш увагі на барацьбу з цякучасьцю рабсілы. Аднак, да гэтага часу, ня гледзячы на тое, што штат заводу ніяк нельга ўкамплектаваць і завод стаіць перад пагрозай невыкананьня прамфінпляну з-за недахвату рабочых, заводзкія арганізацыі ня прымаюць належных мер для барацьбы з цякучасьцю і для падрыхтоўкі кадраў.

Прагулы параўнальна з мінулым годам таксама не паменшыліся. Барацьба з прагульшчыкамі вядзецца, галоўным чынам, толькі адміністрацыяй. **Заўком-жа, парт'ячэйкі і грамадзкія арганізацыі аддаюць гэтаму пытаньню мала ўвагі.** Тое самае адносна барацьбы з дэзэртырствам.

З боку Наркампрацы ў справе барацьбы з дэзэртырствам няма амаль ніякай дапамогі. Характэрна адзначыць наступны факт. На заводзе доўгі час працаваў у якасьці качагара злосны прагульшчык і п'яніца Казлоў. Жадаючы дэзэртыраваць з заводу, ён зрабіў некалькі прагулаў і за гэта, як злосны прагульшчык і п'яніца, быў звольнены. І што-ж аказваецца? Праз некалькі дзён гэты-ж Казлоў паступіў на завод «Бальшавік» на такую-ж пасаду. Пасьля гэтага рабочыя заводу гіранічна гаворыць: «Нічога, ніхай адміністрацыя звольніць, Наркампрацы пашле на іншае месца».

ЗАВАДЗКІ.

За адзін месяц

864 прагулы на „Дзьвіне“

Аднэй з важных прычын невыкананьня прамфінпляну на фабрыцы **«Дзьвіна»** (Віцебск) зьяўляецца агідная становішча з працэсцыплінай. Прагулы за першую палову лістапада на фабрыцы складаюць 497 рабочых дзён, за другую палову — 367. Толькі ў ватарным цэху было за лістапад 535 прагулаў.

Месячнік штурму прарываў (за кастрычнік невыкананьне на 14 проц., за лістапад — 9,96 проц.) паставіў пытаньне аб поўнай ліквідацыі прагулаў, аб рашучай барацьбе са злоснымі прагульшчыкамі. Да гэтага часу не дапамагалі ні выклікі на пасяджэньні цэхпрафкамітэтаў, ні зьмяшчэньне на чорнай дошцы. Нарэшце, фабком сам узяўся за гэту справу. Былі праведзены два сходы са злоснымі прагульшчыкамі. Выявілася, што ёсьць работніцы, якія на працягу трох месяцаў зрабілі па 4-5 прагулаў (работніцы Шакінкоп, Гарватоўская, Скумоп, Марчанка). Прычыны такія: адна «хацела паехаць у Маскву да сястры», другая жыве «далёка» ад фабрыкі і «прасынае», рабочы Бліноў проста захацеў два дні насядзець дома і «адпачыць» і г. д.

Сходы прынесьлі дадатныя вынікі. Прагульшчыкі абяцалі больш прагулаў не рабіць. Работніца Марчанка пасьля сходу абвясьціла сябе ўдарнай. Толькі рабочы Бліноў і работніца Сысоева і Ўладзімірава адмовіліся даць абяцаньні не рабіць прагулаў. За гэта сход нарашыў арганізаваць над імі паказальны таварыскі суд.

Так на фабрыцы «Дзьвіна» змагаюцца з прагульшчыкамі.

Шафран.

Грамадзкая застава

змагаецца з цякучасьцю

Для выкананьня прамфінпляну 1931 г., заводу «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК» трэба значна павялічыць колькасьць рабочых. Але гэта толькі палова справы. Асноўнае — заводу трэба дабіцца ЗНІШЧЭНЬНЯ ЦЯКУЧАСЬЦІ РАБОЧАЙ СІЛЫ, што зьяўляецца галоўнай небясьпекай выкананьня прамфінпляну. Пакуль што на заводзе толькі каля 300 рабочых далі самаабавязацельства працаваць да канца пяцігодкі. Для павялічэньня гэтай колькасьці ніякай растлумачальнай і палітычнай работы амаль не вядзецца. Усё яшчэ назіраюцца выпадкі ўходу з прадпрыемства. Праўда, на заводзе ёсьць так званая «ГРАМАДЗКАЯ ЗАСТАВА», якая выяўляе прычыны жаданьня таго ці іншага рабочага пакінуць завод і робіць усё магчымае, каб зьнішчыць гэтыя прычыны. У адносінах сьвядомых рабочых праца «грамадзкай заставы» мае посьпех, але ёсьць рабочыя, якія наўмысна робяць прагулы, п'янствуюць, хуліганяць толькі для таго, каб іх звольнілі. Такіх рабочых таксама трэба перавыхоўваць і толькі ў крайнім выпадку звальняць, але так звальняць, каб яны ніякора трапілі знову на работу (закон дае права такому рабочаму 6 месяцаў не даваць работы).

Кепска стаіць справа з падрыхтоўкай кваліфікаваных рабочых. Трэба было на заводзе арганізаваць тэхнічныя курсы.

Ш. МУРОХ.

Узмацніць растлумачальную работу

НА МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ САМАКАНТРАКТАЦЫЯ РАБОЧЫХ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ ПРАХОДЗІЦЬ СЛАБА. З 1.000 РАБОЧЫХ ДАЛІ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ НЕ ГАКІДАЦЬ ФАБРЫКІ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ ТОЛЬКІ 647 ЧАЛАВЕК.

ФАБРЫЧНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ТРЭБА УЗМАЦНІЦЬ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ АБ ЗНАЧЭНЬНІ САМАКАНТРАКТАЦЫІ.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ».

Р. ФАЙНБЭРГ

(ШКОЛА КРАЎШОЙ)

Спаборніцтва

Умова падпісана, пункты перапісаны...
Дзень за днём—настрымны іх разьбег.
І жыцьця прывычная аблічча
Зьмяняецца ў віхрыстай барацьбе.

Там барацьба за выкананьне прамфінпляну,
Там фронт—варштат, там фронт — завод,
Там армія — мільёны рук аддана
Выконваць вялікі план работ.

Штаб баявы — вытворчая нарада,
Даў загад па цэхах і брыгадах.
Загад, што кліч і просты і кароткі:
— Энтузіязмам запаліць прадвесьне пяцігодкі!

... І гоман скоры шумнага матора,
Што крок, што рух, ён родзіць новы ўзьлёт.
Ударныя брыгады — узброеныя атрады
Там, дзе фронт,—завод.

Шпарка, няспынна і басьперапынна,
Ударнік-рабочы, хутчэй, хутчэй!
Нават прывычная песьня канвэеру
Сёньня гучыць звакчэй!

З гонарам цэх наш ударным стаў звацца,
Сёньня ў нас дзесяць ударных брыгад.
Нам тэмпы патрэбны, патрэбна нам праца
Каб зьдзейсьніць краіны загад.

А загад дан:
Выканаць і
Перавыканаць прамфінплян.

„Чырвоная Бярэзіна“ і „Пралетарская Перамога“

АДСТАЮЦЬ

Другі год пяцігодкі фабрыкі «Чырвоная Бярэзізна» і «Пралетарская перамога» скончылі прамфінпляны з вялікай запазычанасьцю дзяржаве. Недавыраблена 72.000 скрынак запалак і 235.000 сядзеньняў. Нявыкананы былі і якасныя паказальнікі. Так, толькі на адным зьніжэньні сабекошту фабрыкі не дадалі 180.000 рублёў.

Адозва ЦК УсеКП(б) ускалыхнула рабочую масу, здавалася, што ва ўдарным квартале прамфінплян будзе выконваць. Былі дні, калі на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» бяз усякай мэханізацыі штодзенна выраблялася па 1.200 скрынак запалак.

Але 75 дзён работы ўдарнага кварталу і 40 дзён манэўраў паказалі, што заводакіраўніцтва і грамадзкія арганізацыі фабрык ня здолелі стаць на чале энтузіязму рабочых. За гэты час фабрыкамі «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» недавыраблена 40 тысяч скрынак запалак, 19.800 сядзеньняў, і 677 ватэрпасаў.

Пасьлядніе дні работы фабрык паказалі, што прамфінплян ня толькі можна выканаць, але нават і перавыканаць. Аб гэтым гаворыць такі факт, калі адна зьмена фабрыкі «Пралетарская перамога» вырабіла 860 скрынак. Абсталяваньне ф-кі дае магчымасьць выпускаць нават па 1.000 скрынак у зьмену. Але гэта абсталяваньне покуль скарыстоўваецца толькі на 75-80 проц., а ў паасобных цэхах яшчэ менш.

Кіраўнікі фабрыкі ўвесь час шукаюць «аб'ектыўных» прычын для свайго апраўданьня. Так, у першым месяцы ўдарнага кварталу па іх думцы, «вузкім месцам» на фабрыцы быў шчапальны цэх, але варта было заводзкім арганізацыям узяцца за гэты цэх, узварушыць рабочую грамадзкасьць, як шчапальны цэх перастаў быць «вузкім месцам». Цэх дае шчапу і саломку ня толькі для абедзьвюх фабрык, але нават і нарыхтаваў ужо вялікі запас.

Замест вызначаных 1.700 каробак на аднаго чалавека ў дзень, на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» ў кастрычніку вырабляліся 1.462 каробкі (84 проц. заданьня). На фабрыцы «Пралетарская перамога» замест вызначаных 2.890 каробак у дзень, у кастрычніку вырабляліся 2.096—72 проц. Такое-ж становішча і з выкананьнем якасных паказальнікаў. Так па зьніжэньні сабекошту не дадана ва ўдарным квартале 85.000 руб.

Лістапад і сьнежань ня далі адпаведнага зруху. Так за 15 дзён сьнежня «Чырвоная Бярэзіна» выканала прамфінплян на 92 проц., а «Пралетарская перамога» на 84 проц.

Пасьля адозвы ЦК УсеКП(б) ва ўдарныя брыгады ўступіла звыш 1.600 рабочых і работніц. Камсамольскім калектывам было створана 12 ударных камун, якія пачалі працаваць сапраўды па-ўдарнаму. Але зараз гэтыя брыгады пачынаюць развальвацца. Цэхавыя парт. і праф'ячэйкі ня кіруюць брыгадамі. Няма ніякага ўліку работы ўдарных брыгад і кожнага ўдарніка паасобку.

Ня гледзячы на рад агульна - фабрычных і цэхавых пастаноў аб увядзеньні справаздач загадчыкаў цэхаў аб выкананьні прамфінпляну за кожную дэкаду—гэта пакуль не ажыцьцёўлена. Дырэктыва партыі аб давядзеньні прамфінпляну да кожнага цэху таксама ня выконваецца.

Прафесіянальныя арганізацыі фабрыкі ўсё яшчэ не перагрупіраваліся тварам да вытворчасьці. Рабочыя прапановы аб палепшэньні вытворчасьці дяжаць над сукном. Ніякай падрыхтоўкі да трацяга году пяцігодкі не вядзецца.

Кіраўніцтва фабрык «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» павінна быць неадкладна ўмацнена. Заводзкія арганізацыі павінны стаць на чале рабочай ініцыятывы

Н.

Адзін з ініцыятараў плянава-апэрацыйных груп, ударнік заводу «Камунар» т. Пеўцаў.

ВЕСТКІ ПЕРАМОГ

ГАРБАРНІ „БАЛЬШАВІК“ І „ПРАЛЕТАРСКІ ШЛЯХ“, МЕНСКАЯ, БАБРУЙСКАЯ І ГОМЕЛЬСКАЯ ШЧОТАЧНЫЯ ФАБРЫКІ ДАТЭРМІНОВА СКОНЧЫЛІ ПРАГРАМУ АСОБНАГА КВАРТАЛУ

У БОЙ

за прамфінплян

ТРЭЦЯГА ГОДУ

Рабочыя, служачыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік» у рапарце першай Менскай гарадзкой партканфэрэнцыі заяўляюць:

Намаганьнямі ўдарнікаў, усяго рабочага калектыву і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу 28 сьнежня завод «Бальшавік» датэрмінова скончыў праграму ўдарнага кварталу ў разьмеры 100,92 процантаў.

Сабекошт прадукцыі ва ўдарным квартале зьніжан на 12,17 проц. замест 6 проц., вызначаных плянам.

За ўдарны квартал рабочыя ўнесьлі 296 рацыяналізатарскіх прапаноў, якія даюць 37.000 рублёў эканоміі.

Падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» дасягнула 41.055 рублёў, што складае 112,77 проц. кантрольнай лічбы.

Дасягнутыя намі посьпехі зьяўляюцца пішнім доводам правільнасьці ўзятых партыяй і рабочай клясай узмоцненых тэмпаў па разгортваньні сацыялістычнага будаўніцтва як у горадзе, так і на вёсцы.

Дасягнутыя намі посьпехі даюць больш натхняюць нас на далейшую барацьбу для ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Для ўзмацненьня нашай камуністычнай партыі мы пасылаем у яе рады 23 лепшых нашых ударнікаў, каб яны пры нашай дапамозе змагаліся за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

У бой за ажыцьцяўленьне прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Нехай жыве пенінскі ЦК УсеКП(б), нехай жыве правадыр нашай партыі —тав. СТАЛІН!

Сакрэт посьпеху

ЗАВОДУ „ПРАЛЕТАРЫ“

23 сьнежня завод «Пралетары» (Гомель) датэрмінова скончыў праграму асобнага кварталу. Гэта перамога дасталася заводу нялёгка. Бытворчую праграму другога году пяцігодкі «Пралетары» таксама выканаў да тэрміну.

У чым сакрэт посьпехаў заводу «Пралетары»?

На «Пралетары», як і на іншых мэталапрацоўчых заводах, ёсьць порабой у забесьпячэньні сырцом. Рабочых «Пралетара» таксама, як усе іншыя, перажываюць труднасьці ў сэнсе харчаваньня.

Завод знаходзіцца на адлегласьці ад чыгункі, уся прадукцыя і ўвесь сырэц адвозіцца і прывозіцца на завод гужавым транспартам.

Сакрэт перамогі заключаецца ў тым, што партканкэтыў адолеў згуртаваць вокал выкананьня прамфінпляну асноўную масу рабочых заводу і павесьці рашучую барацьбу з апартуністычнымі настроямі былых кіраўнікоў.

Праграма на асобны квартал выканана ў разьмеры 1.288.000 рублёў—на 57 проц. больш, чым у квартальным выпуску прадукцыі 1929-30 г.

На 1931 г. Белмэталпрам'аднаньнем даны кантрольныя лічбы прадукцыі заводу ў разьмеры 5.807.000 рублёў. Рабочыя высунулі свой сустрэчны прамфінплян, які складае 6.223.000 рублёў.

Да кожнага рабочага быў даведзен плян трэсту, і кожны даў свой сустрэчны, які ён бязумоўна выканае.

У выніку замест 1120 растворамяшалак, «сквозная» брыгада высунула 1440, замест 530 лябёдак, другая «сквозная» высунула 720. Замест 2040 тон чыгуннага ліцьця, ліцейшчыкі высунулі 2275. Замест павышэньня прадукцыйнасьці працы на 18 проц., рабочыя высунулі 29 проц. Замест зьніжэньня сабекошту на 14 проц., рабочыя высунулі 15,5 проц.

Вось лічбы сустрэчнага прамфінпляну, складзенага самімі рабочымі.

У трэцяй пяцігадзьдзі сьнежня некаторыя цэхі злалі свае пазыцыі. Але, дзякуючы добра наладжанаму ўліку, на гэтым заводзе аб гэтым адразу-ж даведаліся заводзкія арганізацыі. Увесь рабочы калектыў заварушыўся. Гэта супала з генэральным аглядам прамысловасьці, пачатым па ініцыятыве «Зьвязды».

Арматурны цэх, які меў прарыў, за першыя пяць дзён агляду выканаў прамфінплян з перавышэньнем—103 проц. Капельны цэх, дзе таксама быў прарыў, дае 116 проц. праграмы. Спаборніцтва ахапіла ўвесь завод. Так «Пралетары» дабіўся перамогі, якая зьяўляецца моцным ударам па апартуністах, што ня верылі ў сілы рабочага калектыву.

Завод «Пралетары» мае пэўныя падставы на атрыманьне прэміі на ўсесаюзным конкурсе.

Б. Зэльманаў.

Даць баявы сустрэчны

Праграма віцебскага заводу «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» на першы квартал 1931 году, часткова зьмененая Белмэталпраб'аднаньнем, запрасітавана на агульную суму 2.099.400 руб. і складаецца з наступных вырабаў: плугоў ДТЛРМ — 15.000 штук, плугі «Эбэргард» — 300 шт., бораны «Гонкмо» — 25.000 шт., бораны «Эбэргард» — 500 шт., нораньрэзкі — 1.500 шт., акучнікі — 15.000 шт., лябёдкі — 700, трансьмісійных точак — 2.250 шт., сячкарэзь — 100 і запасных частак на 150.000 руб.

Разглядаючы зьмененую праграму, трэба адзначыць, што асноўныя аб'екты сельска-гаспадарчых машын у праграме заводу засталіся, за выключэньнем плугоў конных цягі.

Як стаіць справа з падрыхтоўкай заводу да новай праграмы? Тэхнічная частка НЯ ЗУСІМ ДОБРА СПРАВІЛАСЯ З СВАЁЙ РАБОТАЙ. Так, па бораных «Эбэргарда» штампы не гатовы, таксама не гатовы малэці для чыгуннага ліцьця, для плугоў «Эбэргарда», наогул скончана падрыхтоўка да выпуску карнарэзак.

Збэрачна-мэхнічны цэх прамфінпляну на 1931 год яшчэ не атрымаў, а праграма на першы квартал новага гаспадарчага году не прапрацоўваецца, бо няма ўпэўненасьці ў тым, што гэта праграма застанецца. У апошні час праграма зьмяняецца амаль кожны месяц. На сёньнешні дзень цэх ня мае нагрузкі, бо іншыя цэхі не падаюць пэўфабрыкатаў.

Калектыву «Чырвонага мэталіста» трэба неадкладна мабілізавацца і больш шпаркімі тэмпамі скончыць падрыхтоўку да трэцяга году пяцігодкі.

СУХАРУЧКІН, РАБКІН.

На 17.000 руб. звыш пляну

АБЯЦАЮЦЬ ВЫРАБІЦЬ МЕНСКІЯ ШТОТАЧНІКІ

27 СЬНЕЖНЯ МЕНСКАЯ ШЧОТАЧНАЯ ФАБРЫКА ВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯН УДАРНАГА КВАРТАЛУ. РАБОЧЫЯ АБЯЦАЮЦЬ ДА КАНЦА КВАРТАЛУ ВЫПУСЬЦІЦЬ ЗВЫШ ПЛЯНУ НА 17.000 РУБ. ПРАДУКЦЫІ.

ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ ЎЗЬНЯТА НА 21 ПРОЦ. ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ 18. ПРОЦАНТ БРАКУ ДАВЕДЗЕН ДА 1,7 ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ 2 ПРОЦ. ПРАГУЛЫ ПА НЯГРУНТОЎНЫХ ПРЫЧЫНАХ ЗЬНІЖАНЫ ДА 0,5 ПРОЦ.

Ударная камсамольская камуна фабрыкі «Прафінтэрн», выканаўшая прамфінплян на 104 проц.

Ганаровы чырвоны сьпіс

УДАРНАГА КВАРТАЛУ

ГОМЕЛЬ. (Па тэлеграфу). Гомельская шчацінная фабрыка і гарбарня «Пралетарскі шлях» датэрмінова скончылі праграму асобнага кварталу.

БАБРУЙСК, 23. Бабруйская шчацінная фабрыка датэрмінова выканала прамфінплян ударнага з перавышэньнем на 5 проц. Сабекошт прадукцыі зьніжан на 7 проц.

У дзень выкананьня прамфінпляну на фабрыцы адбыўся мітынг. Рабочыя абавязаліся выканаць і перавыканаць прамфінплян 1931 году як па колькасных, так і якасных паказальніках і ўсімі сродкамі змагацца за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Х.

Спаборніцтва брыгад

На заводзе **«Камунар»** тры ударныя брыгады скончылі прамфінплян асобнага кварталу. Брыгада тав. Кацэвіча на вырабе батапаваных варштатаў 24 сьнежня першай выканала прамфінплян ударнага. Брыгада абяцае да 1 студзеня выпусьціць дадатковае 20 варштатаў.

На другі дзень 25 сьнежня скончыла прамфінплян брыгада **Кандратовіча** на вырабе камнядрабілак. Брыгада абавязалася да канца кварталу дадатковае даць 18 камнядрабілак.

26 сьнежня скончыла праграму брыгада на вырабе парапонжаў. Дадатковае будуць выраблены дзьве парапомпы.

Плян машынабудаўніцтва на 26 сьнежня выкананы заводам на 130 процантаў.

А. М.

Вінавата не абсталяваньне, а людзі

Праваапартуністычная практыка кіраўніцтва шклоўскай фабрыкі „Спартак“

На шклоўскай папяровай фабрыцы **«Спартак»** крыкам выпрацоўкі за ударным квартале ўвесь час паўзе ўніз. За два з паловай месяцы ўдарнага кварталу **фабрыка не дадала дзяржаве 665 тон паперы.** Замест зьніжэньня сабекошту на 6 проц. фабрыка ў кастрычніку **павысіла сабекошт на 9 проц. і ў лістападзе—на 4 проц.**

Заводакіраўніцтва і тэхнічны пэрсанал лічаць, што галоўнай прычынай прарыву на фабрыцы зьяўляецца нібы непадрыхтаванасьць яе да такога пляну і часткова зношанасьць абсталяваньня.

Але больш дэталёвае азнаямленьне з сапраўдным становішчам на фабрыцы адразу-ж паказвае, **што гэта яўная праваапартуністычная ўстаноўка ня мае пад сабой ніякай падставы.**

Лепшым доводам гэтага зьяўляецца тое, **што машыны працуюць з ніпоўнай нагрузкай.** Паводле пляну першая машына павінна выраблівць у гадзіну **1.070** кілёграм альбомнай паперы, фактычна яна выробляе ўсяго **800-900** кілёграм. Між тым, у сакавіку кожная машына выробляла ў гадзіну **1.120** кілёграм.

Прастоі на фабрыцы таксама дасягаюць непамерных разьмераў—13 проц.

Такім чынам, тут вінавата не абсталяваньне, **а людзі, якія ня здолелі яго як належыць скарыстаць.**

Рамонт машын праводзіцца бясплана. Машыны ніколі не аглядаюцца цалкам. Робіцца рамонт толькі сапсаванай часткі, а праз некалькі гадзін машына зноў спыняецца, бо папсавалася другая частка.

Зьмена мокрых сукан на машынах складае значны процант прастою. Але ўжо некалькі месяцаў, як на фабрыку прыбылі спэцыяльныя сукнамыйкі, якія мыюць сукны ў часе работы. Гэта значна скарачае прастой. Але чамусьці сукнамыйкі ляжаць сабе на складзе, устаноўка іх з кожным месяцам усё адтэрміноўваецца.

Якасьць прадукцыі таксама за апошні час усё пагоршваецца. Бываюць выпадкі, калі цэлыя вялікі паперы вагой у 200 кілёграм пасылы прахаджэньняў усіх сталый апрацоўкі **на 90 проц. заказаліся бракаванымі.**

У бюро рацыяналізацыі ўжо на працягу некалькіх месяцаў марынуецца шмат каштоўных прапаноў.

Вытворчыя манэўры, якія былі абвешчаны на фабрыцы з 25 кастрычніка па 5 лістапада, узьнялі сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва на яшчэ вышэйшую ступень. Але непадрыхтаванасьць адміністрацыі і дрэнная кіраўніцтва тэхнічнага пэрсаналу прывялі да таго, што нават і ў часе вытворчых манэўраў прамфінплян ня выконваўся амаль на 20 проц. Гэта адразу-ж адбілася на энтузіязме рабочых. Калі да пачатку манэўраў на фабрыцы налічвалася 57 ударных брыгад, дык цяпер засталося толькі некалькі дзесяткаў, рэшта-ж мэханічна распалася.

Асноўнай прычынай гэтага зьяўляецца адсутнасьць усякай культурна-выхаваўчай работы і адсутнасьць кіраўніцтва брыгадамі.

Адміністрацыя зусім сваёасабліва ўявіла пункт аб адзіначальні. Так, намесьнік дырэктара аднойчы зайшоў у цэх і, зьвярнуўшыся да аднаго сядзеўшага рабочага, скамандаваў:

«Устаць, хіба ты ня ведаеш, з кім гаворыш, ці ты ня ведаеш, што я дырэктар адзіначальнік».

Калі да гэтага самага нам. дырэктара зьвярнуўся адзін з рабочых з заўвагай аб тым, што ён скарыстоўваецца не на прызначэньні, нам. дырэктара сярдзіта адказаў:

— Ня ваша справа ўказваць. Хто распараджаецца—мы ці вы?

Зразумела, што такое адміністрацыйнае «выхаваньне» ня можа спрыяць узьнясьцю працдысцыпліны на фабрыцы.

Раённая РСІ, якая нядаўна абсьледвала работу фабрыкі, абвясьціла вымову ўсяму складу заводакіраўніцтва.

Заводзкія арганізацыі павінны зрабіць з гэтага адпаведныя вывады. Пара ўжо сапраўды павярнуцца тварам да вытворчасьці.

ІТС.

Кансэрватызм адміністрацыі—

АСНОЎНАЯ ПЕРАШКОДА

Віцебская фабрыка **«Дзьвіна»** на працягу амаль усяго ўдарнага кварталу ня выконвае нытворчае праграмы. Нават месячнік штурму па ліквідацыі прарыву, які быў праведзен на фабрыцы ў лістападзе, ня даў патрэбных вынікаў.

У першай дэкадзе студзеня

Мабілізуем масы на бальшавіцкае правядзеньне перавыбараў,

Аб зьмяшчэньні ў друку антыпартыйнага артыкулу Пайкіна

ПАСТАНОВА БЮРО ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б ад 22 сьнежня 1930 г.

Бюро Фрунзаўскага раённага камітэту КП(б)Б на сваім пасяджэньні ад 22-га сьнежня ПАСТАНАВІЛА:

1. Пастанову агульнага сходу калектыву КП(б)Б рэдакцыі газэт ад 17-га сьнежня г. г. па пытаньні аб антыпартыйным артыкуле т. **Пайкіна**,—зацьвердзіць.

2. Тав. **Янскага** зьняць з работы ў П. О.—газэце «Зьвязда».

3. Пастанову агульнага сходу партыйнага калектыву рэдакцыі газэт і пастанову Бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б па гэтым пытаньні зьмясьціць у друку.

***

З РЭЗАЛЮЦЫІ АДКРЫТАГА СХОДУ ПАРТКАЛЕКТЫВУ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТ

1. Агульны адкрыты сход калектыву КП(б)Б рэдакцыі газэт, абгаварыўшы пытаньне аб памылках-шкодніцтва артыкулу т. **Пайкіна**, далучаецца да тэй ацэнкі гэтага артыкулу, якая дана ў рэдакцыйным артыкуле газэты «Зьвязда» (ад лістапада), у якім артыкул т. **Пайкіна** кваліфікуецца, як права-«лявацкі» наскок на генэральную лінію партыі.

2. Агульны сход партыйнага калектыву рашуча асуджае паводзіны супрацоўніка газэты «Зьвязда» члена КП(б)Б т. **Янскага**, які замест адкрытага прызнаньня сваіх прымірэнчых адносін да анты-партыйнай вылазкі т. **Пайкіна** (т. Янскі часова выконваў абавязкі загалічыка партыйнага адзелу газэты і асабіста рэдагаваў артыкул т. **Пайкіна**) імкнуўся ўвесьці ў ману як бюро, так і сход цэхавай ячэйкі газэты «Зьвязда», сьвядома ўмаўчаўшы аб тым, што антыпартыйны артыкул Пайкіна праходзіў праз яго.

3. Лічачы тлумачэньні, якія даў тав. Янскі на агульным сходзе партыйнага калектыву, нездавальняючымі і ацэньваючы яго паводзіны, як на цэхавай ячэйцы «Зьвязды», так і на агульным сходзе партыйнага калектыву двурушніцкімі, паколькі т. Янскі на словах рашуча асуджаў артыкул т. Пайкіна, а на справе ўмаўчаў аб тым, што ён гэты артыкул асабліва праглядаў і здаў яго ў друк—сход пастанаўляе:

а) Тав. **Янскаму** за прымірэнчыя адносіны да антыпартыйнай вылазкі тав. **Пайкіна** і за спробу ўвесьці ў ману ячэйковы сход—абвясьціць вымову і зьвярнуцца да адпаведных органаў аб зьняцьці т. **Янскага** з работы ў Ц. О.—газэце «Зьвязда».

4. Прыняць да ведама даведку, што артыкул т. Пайкіна быў вымешчаны ў верасьні 1930 г., да прызначэньня новага кіраўніцтва газэты «Зьвязда» члена КП(б)Б т. **Янскага**, які замест адкрытага прызнаньня сваіх прымірэнчых адносін да анты-партыйнай вылазкі т. **Пайкіна** імкнуўся ўвесьці ў ману як бюро, так і сход цэхавай ячэйкі газэты «Зьвязда», сьвядома ўмаўчаўшы аб тым, што антыпартыйны артыкул Пайкіна праходзіў праз яго.

5. Зацьвердзіць пастанову бюро партыйнага калектыву аб тым, што зацьверты пункт пастановы бюро цэхавай ячэйкі «Зьвязды», які ня быў зацьверджаны агульным сходам ячэйкі «Зьвязды», даў палітычна няправільную ацэнку памылцы т. Янскага, як памылцы на нядбайнасьці, у той час, як парылка зьяўляецца прымірэнчай.

6. Агульны сход партыйнага калектыву зьвяртае ўвагу ўсіх партыйцаў рэдакцыі на неабходнасьць яшчэ большай партыйнай пільнасьці ў справе барацьбы з правым ухілам, як галоўнай небясьпекі на даным этапе з права «лявацкім» блёкам, «левымі» вагібамі з шавінізмамі ўсіх колераў і ацэненяў у асаблівасьці з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, прымірэнчымі адносінамі да ўхілаў.

Падпіска на вёсцы ідзе нездавальняюча

РЭАЛІЗАВАНА ТОЛЬКІ 79,6 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ

Паводле даных на 15-га сьнежня, агульная сума рэалізацыі па БССР пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» дасягнула 15.670.000 руб. Кантрольная лічба падпіскі выканана на 96,1 проц.

На **груле рабочых і служачых** рэалізавана аблігацый пазыкі на 12.456.000 руб. ці 102,8 проц. кантрольнага заданьня. Афармлена падпіскі на суму 11.700.000 руб., або 93,7 проц.

Сярод сялянства рэалізавана пазыкі на 2.165.000 руб., з гэтай сумы сярод калгасьнікаў распаўсюджана аблігацый на 828.000 руб., сярод сялян-адзіпаасобнікаў—на 1.337.000 руб., за наяўны разьлік прадана аблігацый на суму 770.000 руб.

Кантрольная лічба падпіскі па сялянскім сэктары выканана на 79,6 проц., афармлена падпіскі на суму 1.794.000 або 82,8 проц.

Ход падпіскі па сялянскім сэктары трэба прызнаць нездавальняючым. Няма пералому ў рабоце мясцовых арганізацый і камісій садзейнасьці. Даюць аб сабе ведаць напляваецельскія адносіны да мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Кантрольныя лічбы падпіскі на вёсцы павінны быць выкананы. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы патрабуе перамаганьня апартунізму ў рабоце фінансавых і крэдытных органаў на мясцох, рашучай ліквідацыі настроў самацёку.

Сярод неарганізаванага насельніцтва рэалізавана пазыкі на 1.050.000 р. або 72 проц. Гэта— самы адсталы вучастак падпіскі, на які трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу.

разьбіваючы выбарчыя манэўры кулацтва, вымятаючы апартуністаў з кіруючых органаў саветаў

Пастанова ЦВК БССР

Заслухаўшы даклад цэнтральнай выбарчай камісіі аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў БССР, прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР а д з н а ч а е:

1. **Справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў,** ня гледзячы на некаторае запазьдываньне яўкі выбаршчыкаў на сходы і павялічэньне ў складзе сельсаветаў рабочага і партыйнага ядра і кольскасьці жанчын,—**усё-ж праходзіць нездавальняюча.** Адсутнасьць да гэтага часу ад 38 раённых папярэдніх вестак аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі стварае пагрозу ажыцьцяўленьню кіраўніцтва і свалачасовай дапамогі з боку цэнтральных устаноў правядзеньню перавыбараў сельсаветаў у БССР.

2. У значнай частцы раёнаў справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў яшчэ не пастаўлена на чале ўсіх іншых гаспадарча-палітычных кампаній, ёй не надана адпаведнага палітычнага зьместу.

3. У некаторых раёнах слаба арганізавана беднота, батрацтва і калгасьнікі для таго, каб даць рашучы адпор клясаваму ворагу—кулаку, рашуча адстойваць свае кандыдатуры і супроцьпаставіць кулацка-папоўскай агітацыі сваю вытрыманую клясавую лінію.

4. Цэнтральныя і асабліва раённыя газэты слаба асьвятляюць у друку ход справаздачна - перавыбарчай кампаніі, асабліва клясавую барацьбу на вёсцы.

5. Слабы ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі прымаюць прафсаюзныя, камсамольскія і іншыя грамадзкія арганізацыі, якія ў большасьці выпадкаў абмежаваліся фармальным выдачэньнем сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій.

6. Пытаньні выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну ў прамысловасьці, далейшага будаўніцтва саўгасаў, калгасаў у сельскай гаспадарцы і разьвіцьця ў іх сацспаборніцтва, ударніцтва да гэтага часу не зьяўляюцца галоўнымі ў перавыбарчай кампаніі.

Зусім слаба завострана ўвага савецкай грамадзкасьці на выпуленьні і барацьбе з правапартуністычнай практыкай у дзейнасьці саветаў і паасобных выканкомаў (Чарэйскі, Капыльскі і інш. раёны).

7. Усе пералічаныя факты па радзе раёнаў прывялі да паніжэньня процанту яўкі выбаршчыц-жанчын на выбарчыя сходы, да памяншэньня кольнасьці выбраных у склад сельскіх саветаў жанчын, партыйцаў, камсамольцаў і пагул рабочых і батракоў (Бешанковіцкі, Бярэзінскі, Веткаўскі, Чырвонапольскі, Капыльскі, Лядзянскі, Лепельскі, Парыцкі, Чэрыкаўскі, Дубровенскі, Коханаўскі, Сьмілавіцкі, Уверавіцкі, Грэскі і Прапойскі раёны).

Выходзячы з вышэйазначанага, прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР прапануе ўсім раённым выканаўчым камітэтам і саветам:

1. **Зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю актыўнасьці працоўных мас закон справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў,** пастаніць апошнюю на чале ўсіх бягучых палітычна-гаспадарчых кампаній, апіраючыся пры яе правядзеньні на новы масавы актыў ударнікаў-рабочых, калгасьнікаў, беднаты. **Павялічыць агульную яўку выбаршчыкаў, асабліва беднаты, жанчын і калгасьнікаў на справаздачна-перавыбарчыя сходы,** а таксама забясьпечыць поўнае выкананьне дырэктыў аб большым уцягненьні ў новыя склады сельсаветаў партыйцаў, камсамольцаў, калгасьнікаў і жанчын, у першую чаргу работніц, батрачак, бядняцак і калгасьніц.

2. **Прасіць ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ даць па сваёй лініі адпаведныя дырэктывы на месцы аб узмацненьні ўдзелу прафсаюзных і камсамольскіх мас у правядзеньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі саветаў,** а таксама аб своячасовым высьвядзе для пастаянай работы ў сельскіх саветах вылучаных для гэтай мэты рабочых і членаў ЛКСМ.

3. Паказаць цэнтральным і раённым газэтам на **неабходнасьць штодзённа асьвятляць у друку ход справаздачна-перавыбарчай кампаніі,** асабліва завастраючы ўвагу савецкай грамадзкасьці на клясавай барацьбе ў вёсцы і на выкрыцьці ўсіх махінацый кулацтва.

4. Прапанаваць усім выехаўшым у раёны членам ЦВК і ўпаўнаважаным ад цэнтральнай выбарчай камісіі тэрмінова зьвязацца з цэнтральнымі і раённымі газэтамі і кожныя 5 дзён прысылаць ім весткі аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі па мясцох і яе ўвязаці з іншымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі, якія зараз праводзяцца на вёсцы.

5. За непрысылку папярэдніх вестак аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў **абвясьціць вымову з апублікаваньнем у друку** Магілеўскаму, Пухавіцкаму, Рагачоўскаму, Смалявіцкаму, Чэрвеньскаму, Горацкаму, Копыскаму, Бабруйскаму, Буда-Кашалёўскаму і Віцебскаму раённым выканаўчым камітэтам.

6. Лічыць неабходным **паслаць у адстаючыя раёны членаў прэзыдыуму ЦВК, членаў ЦВК і іншых адказных цэнтральных работнікаў** для дапамогі ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі і выпраўленьня тых недахопаў, якія ёсьць у гэтай кампаніі.

7. У мэтах пасьпяховага правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў зьвярнуць асаблівую ўвагу на поўнае выкананьне ўсіх дырэктыў **уряду аб рабоце з батрацка-бядняцкімі групамі пры сельскіх саветах, з жаночым актывам, аб папярэдняй падрыхтоўцы кандыдатур, уцягненьні жанчын у работу саветаў, перабудове работы саветаў у адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.**

8. Даручыць пракуратуры рэспублікі па ўсіх справах аб злосным зрыве справаздачна-перавыбарчай кампаніі праводзіць тэрмінова расьсьледваньні і вінаватых прыцягваць да судовай адказнасьці ў паказальным парадку.

9. Даручыць сакратарыяту ЦВК тэрмінова распрацаваць праект мерапрыемстваў па забесьпячэньні ажыцьцяўленьня пастаноў сэсіі ЦВК у галіне справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

25-га сьнежня 1930 г.
г. Менск.

„Бальшавік" уключыўся ў пераклічку Перавыбары саветаў—пад знакам выкананьня прамфінпляну да тэрміну

Менская чырвонасьцяжная гарбарня «Бальшавік» уключылася ў пераклічку, абвешчаную «Зьвяздой» і ЦСПСБ.

Рабочыя ўзялі на сябе абавязацельства выканаць да 28 сьнежня прамфінплян ударнага кварталу. Старыя рабочыя выклікалі маладых на сацспаборніцтва.

На заводзе праводзіцца дадатковая падпіска па пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады». Пакуль сабрана 8.500 руб.

Праведзены цэхавыя сходы рабочых, асобны сход старых рабочых і агульна-заводзкая канфэрэнцыя па пытаньні ўдзелу ў перавыбарах гарсавету.

Абутковая фабрыка выклікана на спаборніцтва па лепшым удзеле ў перавыбарах савету і выкананьні плану асобнага кварталу.

На гарбарні створана камісія садзейнасьці перавыбарам гарсавету. Вылучаны спэцыяльны пункт пошытаў і шматтыражкі і цэхавыя пасьценгазэты.

1-ы хромавы і жэлятынны цэхі да тэрміну выканалі прамфінплян.

8 новых калгасаў арганізаваліся за час перавыбараў

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Перавыбары саветаў па Магілеўскім раёне праходзяць пад знакам калгаснага прыліву.

Рафалаўскі сельсавет дабіўся вялікіх посьпехаў у галіне выкананьня гаспадарча-палітычных кампаній. За час перавыбараў па сельсавеце арганізавана і афармлена 7 новых калгасаў. Наглядаецца значны прыліў у існуючыя калгасы. Па сельсавеце налічваецца 11 калектыўных гаспадарак, якія ахапляюць 31,7 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Па Белявіцкім сельсавеце за апошнія дні, у сувязі з перавыбарамі, арганізаваўся новы калгас з 18 бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

А. Л.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— **Дом Асьветы.** У 19 гадз. дыспут на тэму **«Клясавая барацьба ў беларускай літаратуры».** Уступнае слова т. **Сяніковы.**

—**ЦБ пралетстуду.** У 17 гадз., у пам. ЦБ пралетстуду, Дом Працы, 2-гі паверх, штабам фізкультэстафэты склікаецца парада, на якую павінны зьявіцца: культпрапаўнікі прафкомаў і камсамольскіх ячэек, а таксама фізкультпрапаўнікі ўсіх навучальных устаноў г. Менску.

— **Навук. асацыяцыя дапатароў.** У 20 з пал. гадз., у пам. ін-ту сац. гігіены—сход гігіенічнай сэкцыі.

— **Пэдгабінэт.** У 19 гадз.—сход выкладчыкаў яўрэйскай мовы і літаратуры.

ЗАЎТРА:

— **БАН.** У 12 гадз.—працяг спрэчак па дакладу т. Артуньянца на тэму: «Да пастаноўкі праблемы Плеханаў—Ленін у сучаснай філёзофскай дыскусіі». У 17 гадз.—заняткі сэмінара «дыялектыка прыроды» пад кір. т. Выдры.

Па Савецкай Беларусі

Брыгада БелАПП'у ў Барысаве

27 сьнежня брыгада БелАППу ў складзе т. т. **Ал. Кучара, Юр. Лявоннага і С. Баранавых** па спэцыяльным запрашэньні рабочых - хэмікаў выязджала ў г. Барысаў. У клюбе хэмікаў быў наладжаны літаратурна-мастацкі вечар з дакладам аб беларускай пралетарскай літаратуры і выступленьнямі пісьменьнікаў.

Перапоўненая заля клюбу, а таксама шматлікія, дзелавыя запытаньні сьведчылі аб значнай запікаўленасьці рабочых мас становішчам і разьвіцьцём пралетарскай літаратуры.

Барацьба з таямным забоем жывёлы

СНК БССР запрапанаваў райвыканкомам выдаць абавязковыя пастановы ў якіх вызначыць месцы, час і паралак гандлю жывёлай, мясам і мясными прадуктамі. Акрамя таго, райвыканкомам запрапанавана павялічыць во ўсіх раёнах пункты кляйменьня мясных прадуктаў.

Продаж на рынках некляйменных мясных прадуктэаў забаронены.

Райвыканкомам і органам міліцыі даручана весьці рашучае змаганьне з таемным забоем жывёлы, а таксама з незаконнай куплай і продажам жывёлы і мясапрадуктаў. Вінаватыя ў парушэньні гэтых правілаў будуць прыцягвацца да адказнасьці.

Кару--гарбарням

ПЯТРЫКОЎ. У вёсцы **Канковічы** звыш 4-х месяцаў ляжаць 280 пудоў лазовай кары і нікуды не адгружаецца. У **Пятрыкове** на складзе спажывецкага таварыства таксама валяецца лазовая кара. Між тым, гарбарні БССР адчуваюць вострую патрэбу ў гэтым сыроцы.

РВК і райспажывецкае т-ва ведаюць аб гэтых фактах і ня ўжываюць мер для адгрузкі кары.

Адказныя рэботнікі--на мабілізацыю сродкаў

Наркамфін БССР камандыраваў 10 адказных работнікаў свайго апарату ў раёны БССР для фарсаваньня мабілізацыі сродкаў. Таварышы **кабуцуць** у раёнах 8-10 дзён.

Падрыхтоўка навуковых кадраў

У мэтах плянавай падрыхтоўкі навуковых кадраў і паляпшэньня навукова-мэтадалёгічнага кіраўніцтва СНК БССР пастанавіў сканцэнтраваць пры Бел. Акадэміі Навук падрыхтоўку кадраў асьпірантаў на сацыяльна-гістарычных, літаратурна-мовазнаўчых, прыродазнаўчых, матэматычных дысцыплінах, тэарытычнай эканоміцы і тэарытычных прадметах.

СНК абавязаў усе ўстановы, якія вядуць падрыхтоўку асьпірантуры па пералічаных дысцыплінах перавесьці да 1-га студзеня 1931 г. БАН'у сродкі на стыпэндыі і навуковую падрыхтоўку асьпірантуры.

Падрыхтоўка асьпірантуры па гісторыі партыі будзе сканцэнтравана ў інстытуце гісторыі партыі. На ўсіх астатніх дысцыплінах падрыхтоўка асьпірантаў будзе праводзіцца пры адпаведных установах.

Навукова-мэтадалёгічнае кіраўніцтва падрыхтоўкі асьпірантуры ўсіх ВНУ і навукова-дасьледчых устаноў ускладзена на Наркамасьветы БССР.

За бязьдзейнасьць--выведзены са складу камсаду

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкредыту і апчадкасправе пастанавіла вывесьці са складу камісіі т. т. **Агранoўскага, Гіпляхевіча, Стракоўскага і Залескага,** якія не наведвалі пасяджэньняў камісіі і ня прымалі ніякага ўдзелу ў яе рабоце. Цэнтральная камісія зьвярнулася ў прэзыдыум ЦВК БССР з просьбай зацьвердзіць гэту пастанову і папоўніць склад камісіі іншымі таварышамі.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ МОПР'у
пераносіцца на 30 сьнежня
АЎТОРАК 30 СЬНЕЖНЯ
З мэтай стварэньня адзінага гаркому МОПР'у ў г. Менску
Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР
Клюб Гарсавету
склікае
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ МОПР'у
Парадак дня:
1. Даклад аб выніках III-га Усебеларускага зьезду МОПР'у і чарговыя задачы—дакл. тав. ЦУДЗІН.
2. Выбары гаркому і рэвіз. камісіі.
Мэтус выбараў дэлегатаў:—на 10 членаў МОПР'у—1 дэлегат. Ячэйкі, якія налічваюць менш 50 членаў— выбіраюць 1-го дэлегата.
Для актывістаў-мопраўкаў ячэйкі МОПР'у могуць атрымаць запрашальныя білеты на канфэрэнцыю.
Мандаты і запрашальныя білеты будуць выдавацца ў ЦК МОПР'у штодзённа з 7-мі да 9-ці гадз. увеч.
ЦК МОПР'у просіць усе ячэйкі МОПР'у гор. Менску зараз-жа прыступіць да выбараў дэлегатаў на канфэрэнцыю, скарыстоўваючы для гэтай мэты ўсе сходы, прысьвечаныя перавыбарам саветаў, на лініі фабзаўмяскомаў, а таксама і сходы, прысьвечаныя кампаніі зімовай дапамогі палітвязьняволенным.
ПАЧАТАК РОЎНА а 7 гадз. увеч.
Гасьля дзелавой часткі—К І Н О.
ЦК МОПР'у БССР.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА".
3 панядзелка, 29 сьнежня, новы выключны фільм
ШЧАСЬЛІВЫ КЕНТ
Драма ў 6 частках.
...«Нехай баязьлівыя адступаюць,
Нехай здрадзікі сьмяюцца,—
Мы будзем абараняць
Чырвоны сьцяг»...
(Песьня гастонскіх тэкстыльшчыкаў).
Рэжысэр— Ул. Шмідгоф.
У гал. ролях:
Кент Потэр —П. САБАЛЕЎСКІ.
Сюзі Мартон—С. МАГАРЫЛ.
Сімасон —І. МАСКАЛЕЎ.
Сябра Кента—В. ЭЛЯНЕЎСКІ.
Пачатак сэансаў: 7 гадз., 8 гадз. 40 м. і 10 гадз. 20 м.
Каса адкрыта з 5 гадз.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ" Сёньня, у панядзелак, 29 сьнежня
БЕСТЭР КІТОН
у пепш. замежным фільме
З—ЭПОХІ—З
Пачатак 1-га сэансу—6 г., 2-га сэансу—7 г. 30 м. 3-га » —9 г., 4-га » —10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 4 г. 30 м.

ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ
МАПА БССР
выданьня Выш. Сав. Нар. Гаспадаркі БССР
З ДАКЛАДНЫМ ПАКАЗАНЬНЕМ
адміністрацыйнага падзелу і лясных масываў,
МАШТАБ 1:500000. ЦАНА 1 руб. 75 кап.
Набыць можна ва ўсіх магазынах Белдаржвыдвецтва ў Менску і інш. гарадох БССР, або праз кіраўніцтва спраў ВСНГБ.

кіно „Інтэрнацыянал" 3 панядзелка, 29 сьнежня
Гістарычны раман
ПАЭТА І ЦАР
Рэжысэр В. Гардзін.
У галоўных ролях:
К. Н. Карэнін.
Е. Чэрыкоў.
Л. Н. Талодка.
Б. Тамарын.
Худалеў.
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз. 30 хв.
Каса—з 4 г. 30 м.

Кіно „СПАРТАК"
3 панядзелка, 29 сьнежня
Усходні мастацкі фільм
НАТЭЛА Драма ў 7 частк.
УВАГА! Штодзенна 4 сэансы.
ПАЧАТАК: 6 г. 30 м., 8 г., 9 г. 30 м. і 11 г.
Каса з 5 гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
Дзьве фільмы ў адзін сэанс.
Мастацкі фільм Аня Гай
Культур-фільм МАЛПА-ПАВІЯН
ПАЧАТАК: 1 гадз. дня, 2 г. 45 м.
Каса—з 12 гадз. дня

30 сьнежня у 8 гадз., у Доме Пісьменьніка,—
ВЕЧАР ДЗІЦЯЧАЙ КНІГІ.
Чарговыя пытаньні беларускай дзіцячай літаратуры.
Выніні Усебеларускага конкурсу на дзіцячую кнігу усякрыцьце канэрэтаў пра лепшых твораў.
Выступаць прадстаўнікі БДВ, НКА, праф. Панкевіч, пісьменьнікі і інш.
Запрашаюцца настаўнікі, піянэрскія работнікі, бібліятэкары, прадстаўнікі культарганізацый.

Да вядома аноансадаўцаў!
Кантора выдавецтва «Зьвязды» паведамляе, што
ПРЫЕМ АБВЕСТАК ВА ЎСЕ ВЫДАЧЫНІ ВЫДАВЕЦТВА:
У газэты: „ЗЬВЯЗДА" „ОРКА" „Раўданзісе Артояс"
У часопісі: „Бальшавік Беларусі" „ПАРТРАБОТНІК" «Бел. Работнік і Сялянка»
УТВАРАЕЦЦА ВЫКЛЮЧНА
канторай выдавецтва „ЗЬВЯЗДА"
г. Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх.
Тэлеф. 781.

У аўторак, 30 сьнежня, у 7 гадз. веч., у пам. рэдакцыі часопісі «БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА» (Энгельса, 28, пак. 12, б. Акруглком) адбудзецца
агульна-гарадзкая нарада рабкорак.
Парадак дня: 1) Аб задачах 3-га году пяцігодкі. 2) Аб праверцы работы далегадкіх сходаў у горадзе.
Яўка ўсіх рабкорак абавязкова. Запрашаюцца таксама рабкоркі насьценгазэт і шматтыражак.

Культпроп ЦК КП(б)Б
просіць усіх т. т., якія жадаюць паступіць на гадавы курс (люгаўскі набор)
інстытуту падрыхтоўкі кадраў чырвонай прафэсуры
(б. падрыхтоўчае аддзяленьне).
неадкладна падаць заяву ў Культпроп ЦК КП(б)Б.
Умовы прыёму гл. у „Праўдзе" ад 19-XII 30 г. і бюлетэнь ЗКО ІКП № 12, стар. 66.

Менскі дашкольны тэхнікум
абвяшчае, што ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ на першым курсе зімовага набору і на кагопкатэрміновых вашкольных курсах АДТЭРМІНОВАН.
Аб пачатку заняткаў будзе абвешчана ў друку.
Заявы прымаюцца ў канц. тэхнікуму—Савецкая, 144.
Дырэктар тэхнікуму Ошерась.

УКРАДЗЕНА
круглая ПЯЧАТКА Асіпавіцкага раённага камітэту саюзу саўгандальслужачых.
Лічыць несапраўдная.

КУЛЬТСЭКТАР ЦСПСБ
склікае на СЕНЬНЯ, 29 сьнежня, у 7 гадз. веч., у залі ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ЦСПСБ,
нараду ўсіх арганізатараў па нац. рабоце
пры культ.-асьвіт. саветах прадпрыемстваў г. Менску,
на пытаньнях культ. абслугоўваньня нац. меншасьцей.
Своячасовая яўка вышэйпаказаных арганізатараў абавязкова.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ
1 і 2 студзеня для апэрацый
БУДЗЕ ЗАКРЫТА
за выключэньнем 1) казначэйскіх апэрацый, 2) прыёму ўзносаў наяўнымі грашыма ў касу банку і 3) выдачы грошай на выплату зарплаты.
Усебелар. к-ра Дзяржбанку.

ДА ЎВАГІ ЎКЛАДЧЫКАЎ.
Даводзіцца да ведамы укладчыкаў, што
31-га сьнежня г. г.
ГАРАДЗКАЯ АШЧАДКАСА № 16
БУДЗЕ ЗАКРЫТА
ў сувязі з складаньнем справаздачы асобнага кварталу.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ГРАМАДЗЯН.
Менгарсаўдпасаюз
ЗАКУПАЕ ТРУСОЎ
па цане ад 5 да 18 руб. Зварачацца: Камсамольская 11, тел. 2-98.

Групком № 3 працасьветы з глыбокім жалем паведамляе ўсіх асьветнікаў аб несподзяванай сьмерці члена саюзу працасьветы, актыўнага грамадзкага працаўніка, загадчыка 35 школы
тав. КАЛІНОЎСКАГА
Вынас цела 29 сьнежня, у 4 гадз. дня з 35 школы (Стара-Мішчанская, 17) на валісковыя могілкі.
Просьба да ўсіх асьветнікаў г. Менску прыняць удзел у пахаваньні.

Калектыў супрацоўнікаў беларускай канторы Саюзнагалгасбанку выказвае сваё спачуваньне супрацоўнікам канторы ЧЭРКІН, РЭЗЕЦКІ МІХАЙЛАЎ з прычыны дачасной сьмерці іх брата
МОНІ.

РЭММАШТРЭСТУ
Менск. Савецкая, 63.
ПАТРЭБНЫ:
2 выявіцелі для прыёму і ацэнкі машынабсталяваньня, каталёў і варштатаў,
1 агэнт для адгрузкі пакозных прадметаў,
1 бухгальтар, пажадана знаёмы з вытворчасьцю па машынабудаўніцтве.

ЧЫТАЙЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ
цэнтральную польскую газэту
TRYBUNA RADZIECKA
GAZETA ROBOTNICZA
Wydawnictwo „Prawdy" organu KC WKP
„Трыбуна Радзецка"— выданьне «Праўды»—органу ЦК УсеКП(б).
„Трыбуна Радзецка"— арганізуе польскія працоўныя масы ў СССР для барацьбы за прамфінплян, калектывізацыю, за польскую пралетарскую культуру, асьвятляе рэвалюцыйную барацьбу працоўных мас фашыстскай Польшчы.
Выпісваць газэту можна толькі на пошце і ў лістаносцаў.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 мес.—30 к., 3 мес. —85 к., 6 мес.—1 р. 60 к., 12 мес. - 3 руб.
Каб унікнуць перапынку ў высылцы газэты, адначасна падпіску зараз-жа.

БДВ СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ
ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА, што Белдзяржвыдвецтвам АДЧЫНЯЮЦЦА:
1-га студзеня 1931 г. Ў РАЁНЕ КАМАРОЎКІ
КНІГАРНЯ № 3 (рог Савецкай і Чырвонасьцяжнай № 141).
У студзені 1931 г. СПЭЦЫЯЛЬНЫ МАГАЗЫН
НАГЛЯДНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ (Энгельса, 4).
КНІГАРНЯ № 2 (Намігоскае, 15)
НАНАВА АДРАМАНТАВАНА
і значна папоўнена вялікім асартымэнтам літаратуры па ўсіх галінах ведаў.

З 27 сьнежня па 8 студзеня 1931 г. будзе праводзіцца
ВЫДАЧА НОВЫХ НАБОРНЫХ КАРТАК
працоўнаму насельніцтву г. Менску.
Наборныя карткі выдаюцца на месцы перарэгістрацыі кніжак—па ЖАКТ'ах і пунктах міліцыі.
Для атрыманьня картак неабходна прадставіць наступныя дакумэнты: дамавую кнігу, паспарт, а для дзяцей да 12 год—матрыка. (У асобных выпадках, калі не паказана выконваемая праца—даводку аб апошняй).
Аплата за картку—10 кап.
Выдача праводзіцца ў альфабэтным парадку. Парадак выдачы па ЖАКТ'ах вывешан у ЖАКТ'ах. У адзяленьні міліцыі № 3 (клюб Леніна пас. станцыя). Выдача праводзіцца—у наступным парадку: 28 сьнежня—літары А, Б, В., 29-XII — Г, Д,—30-XII і 31-XII—Е, К. Аб парадку выдачы картак у раёнах міліцыі № № 1, 2, 4 будзе абвешчана асобна, таксама і па ЖАКТ'ах № 2, 13 і 15.
Рэгістрацыя наборных картак дзіцяцу працягнута да 29-XII уключна.
Праўленьне МЦРК.

Менск, друкарня «Зьвязды».

Менск. Гапоўлітбел